Начны сон немагчыма нічым замяніць, нават доўгім адпачынкам удзень. Толькі 21% дарослых людзей спяць патрэбны час. Змена дня і ночы можа прывесці да развіцця псіхалагічных праблем, зніжэння імунітэту. СТАР 3

Сёння льняныя ручнікі «жывуць» у гарадскіх сем'ях, і не толькі ў якасці радавой рэліквіі; займаюць даволі бачнае і пачэснае месца ў многіх музеях краіны; ручнікам даюць новае жыццё сталічныя тэатры. СТАР 6

Сёлета фінал беларускага адбору на «Еўрабачанне» нагадваў зборнік казак народаў свету. Многія ўдзельнікі, бы па змове, прымерылі на сябе эфектныя вобразы і стварылі адпаведны антураж. СТАР 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

11 СНЕЖНЯ 2012 г. АЎТОРАК № 238 (27353) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ



Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 10 снежня разгледзеў кадравыя пытанні. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

СВЯТЛОВА Барыса Уладзіміравіча — міністрам культуры Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:

ПЕРАСЛАЎЦАВА Аляксандра Сяргеевіча — старшынёй Беларускага вытворча-гандлёвага канцэрна лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці.

КАРЛЮКЕВІЧА Аляксандра Мікалаевіча — дырэктарам — галоўным рэдактарам рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

САЎЧЫЦА Івана Аляксандравіча — членам Брэсцкага аблвыканкама.

Назначаючы міністра культуры, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Барыс Святлоў у гэтай сферы чалавек не новы: «Вы рыхтавалі кадры для Міністэрства культуры і культуры ўвогуле. І павінен сказаць, што вы не проста не пагоршылі сітуацыю ва ўніверсітэце культуры, а значна палепшылі там работу і арганізацыю справы». «Таму я з вялікай надзеяй гляджу на вашу будучую работу ў Міністэрстве культуры. Спадзяюся і думаю, што гэта будзе значны крок наперад пры ўсіх праблемах і цяжкасцях нашай культурнай сферы», — сказаў Прэзідэнт.

Асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка папрасіў звярнуць на ўзвядзенне новага будынка музея Вялікай Айчыннай вайны. «Гэта павінен быць храм, вельмі добры музей», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы таксама даў даручэнне па далейшым развіцці Нацыянальнага гістарычнага музея: «Трэба паглядзець на гэтыя экспазіцыі, падысці па-дзяржаўнаму, так, як гэта прынята ў нашай краіне, і каб гэта ішло ад народа».

Яшчэ адзін важны напрамак работы новага міністра заключаецца ў рэалізацыі дзяржаўнай праграмы адраджэння тэхналогій вытворчасці слуцкіх паясоў. «Нам трэба гэты праект развіваць, зрабіць яго дастойным і нефальшывым. Трэба аднавіць тую вытворчасць. Няхай мы няшмат спачатку будзем вырабляць гэтых паясоў, але гэта павінны быць узоры не горшыя, чым яны былі ў свой час», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Асобнае даручэнне кіраўнік дзяржавы даў наконт хутчэйшага завяршэння рэканструкцыі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы: «Мне абяцаюць, што ў новым тэатры на гэтай пляцоўцы «Паўлінка» будзе ў новым прачытанні. Я з задавальненнем прыйду, паглядж у, і мы адкрыем гэты тэатр. Гэта будзе адзін з лепшых тэатраў Еўропы. Там па апошняму слову тэхнікі ўсё зроблена: і сцэна, і ўмовы для артыстаў».

У цэлым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі створаны ўсе ўмовы для таго, каб творчыя работнікі маглі сябе праявіць.

Звяртаючыся да Аляксандра Пераслаўцава, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што выбар яго кандыдатуры быў у тым ліку звязаны з паспяховай работай на ранейшай пасадзе. «Ваша прадпрыемства і цяпер холдынг («Беларускія шпалеры») — гэта добрая, паспяховая вытворчасць. Яна не завалена і не правалена», — сказаў Прэзідэнт.

«У нас вельмі шмат праблем у дрэваапрацоўцы. Вы бачылі мае жорсткія рашэнні. Я не магу дараваць былому кіраўніцтву зацягванне з уводам магутнасцяў. Гэта ж і адпаведныя страты, — азначыў Аляксандр Лукашэнка. — Вы, дапусцім, ніколі не спыняліся, прыдумвалі нешта новае. Таму і засталіся на плыву. Так павінны былі працаваць і іншыя. Але нават там, дзе Прэзідэнт падпісаў указ па гэтых дзевяці вялікіх камбінатах, былі правалены тэрміны».

«Усе гэтыя мае, скажам так, непапулярныя рашэнні наконт звальненняў, замацавання кадраў на гэтых вытворчасцях, гэта не таму, што іх там не хапае. Проста трэба парадак навесці. Нельга разбазарваць грошы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў, каб усе пытанні развіцця дрэваапрацоўчай галіны вырашаліся максімальна аператыўна: «Мы ў будучым годзе ў асноўным павінны гэтыя вытворчасці выдаць. Справа не толькі ў грошах. Іншыя краіны, дзе ёсць дрэваапрацоўка, не спяць. Яны ўводзяць новыя вытворчасці. А хто першы прыйдзе на рынкі, той і будзе імі валодаць. Попыт на гэту прадукцыю вельмі вялікі».

«Таму я практычна штурмам прапаную ўзяць гэту вышыню. І на дрэваапрацоўцы мы навучым іншых, як трэба працаваць і ставіцца да справы», — падкрэсліў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў бліжэйшы час мае намер наведаць дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы ў Магілёве і Віцебску, дзе размова пойдзе аб рэалізацыі планаў па мадэрнізацыі вытворчасцяў.

Сталіца, як і ўся краіна, рыхтуецца да калядных і навагодніх свят. Нават моцны снегапад, які абрынуўся ўчора на Мінск, не здольны спыніць рух напружанай працы электраслужбаў па ўпрыгожванні электрычнымі гірляндамі і цацкамі ёлак на плошчах горада.

СТЫХІЯ СВЯТУ НЕ ПЕРАШКОДА!

Выпрабаванне моцным снегам

У аўторак пад уплывам атмасферных франтоў з боку Украіны на большасці тэрыторыі краіны пройдзе снег і мокры снег, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

А на ўсходзе Беларусі сёння будзе моцны снег, месцамі наліпанне мокрага снегу і слабы галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ад 0 па ўсходзе да мінус 6 градусаў на захадзе Беларусі.

У сераду і чацвер тэрыторыя краіны трапіць пад уплыў міжземнаморскага цыклону. Амаль паўсюдна будзе ісці снег і мокры снег. Месцамі снег моцны, у асобных раёнах — завіруха і снежныя заносы на дарогах. Тэмпература паветра ў сераду на працягу сутак 0 — мінус 7, уначы на сераду пры праясненнях — да 8—12 марозу. Уначы ў чацвер мінус 3—9, пры праясненнях — да 10—12 марозу, удзень — мінус 1—7 градусаў. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, напрыканцы тыдня наша краіна апынецца на ўскрайку халоднага сібірскага антыцыклону. Стане яшчэ халадней. Месцамі пройдзе кароткачасовы снег. Уначы на пятніцу прагназуецца тэмпература паветра мінус 6—12, пры праясненнях — да 13—16 марозу, удзень — мінус 4—10 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЛІЧБА ДНЯ

Старшыня Мінгарвыканкама Мікалай ЛАДУЦЬКА:

«У шосты школьны дзень трэба больш увагі ўдзяліць фізкультуры і спорту, захаванню здароўя школьнікаў. Часта шосты школьны дзень успрымаецца бацькамі як выхадны, у той час як ён у вучэбным тыдні выдзелены для правядзення культурна-масавых, спартыўных, фізкультурна-аздараўленчых, выхаваўчых мерапрыемстваў, а таксама факультатыўных заняткаў для вучняў 9-11 класаў, працоўнага навучання і прафесійнай арыентацыі».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	– 9°
Віцебск	+ 1°
Гомель	0°
Гродна	– 5°
Магілёў	0°
Мінск	+ 1°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.12.2012 г.

Долар ЗША	8580,00	▼
Еўра	11060,00	▼
Рас. руб.	278,00	■
Укр. грыўня	1051,15	▼

ЕЎРАПЕЙСКІЯ І АЗІЯЦКІЯ МЕДЫЯ — УПЕРШЫНЮ Ў МІНСКУ

10 снежня ў Мінску адбылося адкрыццё VII Форуму еўрапейскіх і азіяцкіх медыя. Тэмай гэтага мерапрыемства, якое ўпершыню прайшло ў беларускай сталіцы, стала еўразійская інтэграцыя — «Інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы і новыя медыя». Форум сабраў больш як 200 кіраўнікоў вядучых СМІ, экспертаў, навукоўцаў, журналістаў з краін СНД, Балтыі, Грузіі, Еўрапейскага саюза, якія прадстаўляюць увесь спектр грамадска-палітычнага жыцця гэтых краін.

Прывітанне ўдзельнікам Форуму накіравалі Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка і Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін. У прывітанні кіраўніка беларускай дзяржавы, зачытаным міністрам інфармацыі Беларусі Алегам Праляскоўскім, была адзначана вялікая роля, якую адыгрываюць сродкі масавай інфармацыі ў інтэграцыйных працэсах. СТАР. 2

■ Пытанні спецыялісту

САЦЫЯЛЬНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ:

КАМУ, ЯК І Ў ЯКІХ ВЫПАДКАХ?

Нашы пытанні мы адрасавалі начальніку аддзела развіцця і каардынацыі сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Таццяне ФЁДАРАВАЙ.

1) *Які парадак залічэння грамадзяніна на сацыяльнае абслугоўванне на даму?*

— Для залічэння на сацыяльнае абслугоўванне на даму неабходна звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы жыхарства і прад'явіць дакумент, які сведчыць асобу (пашпарт), а таксама дакумент аб праве на льготы.

Пасля паступлення звароту супрацоўнікі цэнтра зробяць неабходныя запыты (ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне — аб памеры пенсіі, ва ўстанову аховы здароўя — аб наяўнасці паказанняў і адсутнасці супрацьпаказанняў для сацыяльнага абслугоўвання на даму, у ЖЭС ці ў сельскі Савет — пра месцы жыхарства і склад сям'і) і правядуць абследаванне матэрыяльна-бытавога становішча заяўніка са складаннем адпаведнага акта. Пры гэтым абследуюцца ўмовы пражывання чалавека (забяспечанасць камунальна-бытавым добраўпарадкаваннем, неабходнай для жыцця мэбляй, бытавой тэхнікай, наяўнасць прысядзібнай гаспадаркі, карыстанне прысядзібным участкам, забяспечанасць палівам на зіму і інш.), наяўнасць дзяцей і іншых сваякоў, якія аказваюць або могуць аказваць дапамогу і г.д. СТАР. 5

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УГА ЧАВЕС НАЗВАЎ ПЕРАЕМНІКА

Прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес назваў пераемніка на выпадак новых выбараў, паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы. Чавес у эфіры нацыянальнага тэлебачання заклікаў грамадзян Венесуэлы галасаваць за 50-гадовага кіраўніка МЗС, віцэ-прэзідэнта краіны Нікаласа Мадура. «Ён рэвалюцыянер да мозга касцей, вельмі дасведчаны, нягледзячы на свой параўнальна малады ўзрост, адданы сваёй справе. Я цвёрда перакананы: менавіта за яго вы павінны прагаласаваць, калі будзе прызнана неабходным правесці новыя прэзідэнцкія выбары», — сказаў Чавес. Уга Чавес запэўніў, што працягне змагацца за здароўе, і выказаў упэўненасць, што на гэты раз лячэнне будзе паспяховым.

ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР ІТАЛІІ ХОЧА СЫСЦІ Ў АДСТАЎКУ

Марыа Монці прыняў рашэнне аб адстаўцы пасля таго, як партыя «Народ свабоды» 6 снежня адмовілася падтрымліваць яго кабінет, тым самым зрабіўшы верагоднымі датэрміновыя выбары. Марыа Монці ўступіў на пасаду прэм'ер-міністра Італіі ў лістападзе 2011 года. Ён сфарміраваў урад, асноўнай задачай якога называлася памяншэнне дэфіцыту бюджэту краіны і скарачэнне знешняга доўгу, які дасягаў амаль двух трыльёнаў долараў. За час сваёй працы кабінет Монці сфарміраваў пакет антыкрызісных мер, які ўключаў скарачэнне выдаткаў на ўтрыманне апарату чыноўнікаў, павышэнне пенсійнага ўзросту і шэрагу падаткаў, а таксама ўзмацненне жорсткасці барацьбы з ухіленнем ад іх выплаты.

ЦЁМНЫ ШАКАЛАД ЛЕПШ СПРАЎЛЯЕЦЦА З КАШЛЕМ, ЧЫМ КАДЭІН?

Ад звычайнага кашлю можна пазбавіцца з дапамогай шакаладу, сцвярджаюць спецыялісты. Было даказана: злучэнне, якое змяшчаецца ў какаве, здымае вастрыню сімптомаў пры вострым і хранічным кашлі, піша The Daily Mail. Навукоўцы каментуюць: штодзённае спажыванне шакаладу здольна дапамагчы пры хранічным кашлі (дастаткова з'ядаць па плітцы цёмнага шакаладу). Але калі спыніць прыём, сімптомы зноў нагадаюць пра сябе.

Даследаванне брытанскага Нацыянальнага інстытута кардыялогіі і пульманалогіі паказала: тэабрамін, які ўтрымліваецца ў цёмным шакаладзе, блакіруе працу сэнсарных нерваў. Гэта пазбаўляе ад рэфлексу, які выяўляецца ў выглядзе кашлю. Злучэнне нават больш эфектыўнае, чым кадэін.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ДЗЯСЯТКІ ЛЮДЗЕЙ ЗАГІНУЛІ Ў ЕЎРОПЕ АД МОЦНЫХ МАРАЗОЎ І СНЕГАПАДАЎ

40 чалавек, у асноўным бяздомныя, сталі ахвярамі непагадзі, якая ў гэтыя дні бушуе ў Еўропе. Самая цяжкая сітуацыя склалася на Балканах. У Харватыі, Сербіі, Босніі і Чарнагорыі снег ішоў больш за 30 гадзін запар. Асабліва складаная сітуацыя на аўтадарогах назіраецца ў Сербіі. Тут для расчысткі снежных заносаў і вызвалення з гурбаў аўтамабіляў выкарыстоўваюцца танкі. Абцяжарана праца аэрапортаў у Амстэрдаме, Франкфурце-на-Майне і ў Дзюсельдорфе. Толькі ў аэрапорце Франкфурта 9 снежня было адменена больш за 370 рэйсаў.

На дарогах Германіі за суткі адбылося каля 1000 аўтамабільных аварый. У мэтах бяспекі чыгуначнікі прыпынілі рух хуткасных цягнікоў на шэрагу маршрутаў у Францыі, Бельгіі, Германіі і Нідэрландах.

У Чэхіі, дзе ноччу слупок тэрмометра апускаўся да адзнакі «мінус 27 градусаў», ад пераахаладжэння памерлі сем чалавек.

КАРОТКА

Валавы знешні доўг Беларусі за трэці квартал 2012 года зменшыўся на $175,1 млн і на 1 кастрычніка склаў $32 965,9 млн, паведамляе Нацбанк. З пачатку гэтага года валавы знешні доўг Беларусі знізіўся на $1 057,2 млн.

Міністэрства юстыцыі сумесна з іншымі дзяржаўнымі органамі працягвае прапрацоўку прапаноў праваахоўных органаў па ўдасканаленні заканадаўства, якое рэгулюе пытанні процідзеяння карупцыі. Адна з прапаноў — увесці абавязковае адкрытае апублікаванне звестак з дэкларацый дзяржслужачых, якія ўваходзяць у кадравыя рэестры кіраўніка дзяржавы і ўрада. Разглядалася пытанне ўстанаўлення ў законе і прапаноў аб тым, што дзяржаўная службовая асоба абавязана перадаваць у даход дзяржавы маёмасць у памеры, які істотна перавышае яго даходы, паходжанне якога гэта службовая асоба не можа пацвердзіць.

Чарга з 800 грузавікоў на выезд з Беларусі стаяла ў пункце пропуску «Каменны лог» — «Мядзінінкай» на беларуска-літоўскай мяжы. 5 снежня ў Літве былі затрыманыя 29 супрацоўнікаў мытні менавіта гэтага кантрольна-прапускнога пункта. Яны падазраюцца ў злоўжыванні службовым становішчам і хабарніцтве. Затрыманні прывялі да запаволення працы пункта пропуску, з-за чаго на ўезд у Літву ўтварыліся шматкіламетровыя чэргі фур.

ЯКІЯ МОМАНТЫ ВЫ УСПАМІНАЕЦЕ ЯК САМЫЯ ЯРКІЯ Ў СВАІМ СТУДЭНЦКІМ ЖЫЦЦІ?

Надзея РАДЗЕВІЧ, студэнтка мастацка-графічнага факультэта Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта:

— Вельмі запамінальныя для мяне мерапрыемствы, у якіх удзельнічае мой універсітэт, сярод іх «Зялёны яблык», «Студэнцкая вясна». Добрыя ўражанні заўсёды застаюцца ад сустрэч, калі да нас прыязджаюць студэнты з Беларусі, у нас ладзяцца выстаўкі. Таксама на нашым факультэце ўсе студэнты, нібы адна сям'я. І нават да выкладчыкаў можна прыйсці і проста паразмаўляць пра жыццё. Гэта дазваляе не адчуваць сябе самотнай. І ўсё гэта разам дае пачуццё свабоды. Думаю, што і праз гады пранясу гэтыя ўспаміны са студэнцкага жыцця.

Анастасія ПІШЧЫК, выпускніца біялагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна:

— Пяць гадоў ва ўніверсітэце далі многае і запомніліся многім. Яркімі былі нашы паездкі на практыку, дзе мы збіралі гербарыі і калекцыі насякомых. Запомніцца надоўга і падрыхтоўка да дыпломнай працы, калі мы эксперыментальную частку праводзілі на працягу двух гадоў і дабіваліся выдатных вынікаў. Я жыла ўвесь час на кватэры, таму, магчыма, некаторыя спакусы студэнцкага жыцця мяне абмінулі, але ж у нас была свая кампанія сябровак, з якімі мы і ў кіно хадзілі, і на дыскатэкі, а калі дні народзінаў святкавалі, дык пра гэта ведаў амаль увесь факультэт. Але незалежна ад таго, свята ў нас было ці мы жылі падрыхтоўкай да экзамену, заўсёды мы адчувалі еднасць сяброўства.

Веста СУХВАЛАВА, студэнтка факультэта фізічнай культуры і спорту Смаленскай дзяржаўнай акадэміі фізічнай культуры, спорту і турызму:

— Я з радасцю ўспамінаю мерапрыемствы, якія ладзяцца да Дня першакурсніка, бо кожны год кафедры прэзентуюць цікавыя нумары. Безумоўна, запомніцца злёт выдатнікаў у Турцыі, дзе збіралася кампанія з трынаццаці спартыўных ВНУ, каб паўдзельнічаць у спартыўных, інтэлектуальных і творчых конкурсах. Яшчэ я жыву ў інтэрнаце і выконваю абавязкі старасты паверха. І ў нас здараюцца розныя сітуацыі, напрыклад, неяк «зіма» да нас прыйшла заўчасна, калі распылілі вогнетушыцель. А неяк дзеля жарту кагосьці на кухні зачынілі...

Падрыхтавала Алена ДРАПКО.

БЕЛАРУСЬ ГАТОВА НАРОШЧВАЦЬ ГАНДЛЁВА-ЭКАНАМІЧНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА З ІРАНАМ

Гэта адзначыў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 10 снежня на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь Сеедам Абдалой Хасейні ў сувязі з завяршэннем яго дыпламатычнай місіі ў нашай краіне.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што сустракаецца не з кожным паслом, які пасля завяршэння сваёй дыпламатычнай місіі пакідае Беларусь, а звычайна — з сябрамі: «Я гэтага не скрываю і хачу сказаць, што расставацца з сябрамі заўсёды шкада».

Пры гэтым Прэзідэнт выказаў надзею, што кіраўніцтва Ірана знойдзе такога ж дастойнага пасла, каб Беларусь развівала адносіны з іранскай дзяржавай і народам. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, «што мы ў гэтым вельмі зацікаўлены — і не толькі развіваць нашы адносіны ў тым жа рэчышчы, але і штосьці дабаўляць, я на гэта вельмі спадзяюся».

Кіраўнік дзяржавы перадаў самыя добрыя пажаданні Прэзідэнту і духоўнаму лідару Ірана.

«Што датычыцца нашых адносін з Іранам у сферы палітыкі, у нас няма абсалютна ніякіх праблем. У нас падобныя пункты гледжання на светаўладкаванне і тое, як развіваецца свет, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы актыўныя прыхільнікі шматпалярнасці, неўмяшання ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў».

Пры гэтым Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў: «Што датычыцца эканомікі, то, нягледзячы на вялікія праблемы, якія сёння існуюць у свеце, і нягледзячы на той беспрэцэдэнтны націск, які ў эканамічных і фінансавых адносінах аказваецца на Іран, мы ўсё ж маем адносна нядрэнны двухбаковы тавараабарот. Хоць ён у гэтым годзе крыху зменшыўся».

У сваю чаргу Сеед Абдала Хасейні падкрэсліў, што Беларусь і Іран за апошнія пяць гадоў істотна пашырылі напрамкі ўзаемадзеяння. Дыпламат адзначыў, што за час яго работы ў Беларусі зроблены значныя крокі па развіцці двухбаковых адносін. «Калі я прыехаў у Мінск у верасні 2008 года, то іранскія інвестыцыі ў Беларусь складалі амаль $6 млн, у снежні 2012 года гэты паказчык дасягнуў больш як $960 млн у выглядзе банкаўскага капіталу і інвестыцыйных праектаў», — падкрэсліў Сеед Абдала Хасейні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРАПАНУЕ ЎЛІЧВАЦЬ РЭКАМЕНДАЦЫЮ БРСМ ПРЫ ПРАЦАЎЛАДКАВАННІ Ў ПРАВААХОЎНЫЯ ОРГАНЫ

На гэта ён звярнуў увагу 10 снежня на сустрэчы з першым сакратаром Цэнтральнага камітэта ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Ігарам Бузоўскім, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што БРСМ, таксама як і арганізацыя «Белая Русь», з'яўляюцца добрым рэзервам кадраў.

«У частцы Камітэта дзяржбяспекі, МУС, усіх праваахоўных органаў мы выйдзем на тое, што патрэбна будзе рэкамендацыя Саюза моладзі, каб працаваць на гэтай ніве, і таму ў гэтым плане будзе ўзмацняцца роля маладзёжнай арганізацыі», — сказаў Прэзідэнт. «Камусьці ён падабаецца, камусьці не падабаецца, але прыкладна паўмільёна чалавек сёння з'яўляюцца рэальнымі членамі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, якія маюць членскія білеты і плацяць узносы. І няхай гэта невялікія ўзносы, вялікія і не трэба, можа, цяпер, хто хоча больш дапамагчы, той дапаможа, справа не ва ўзносах, але гэта рэальная колькасць», — сказаў ён.

ЕЎРАПЕЙСКІЯ І АЗІЯЦКІЯ МЕДЫЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На ўрачыстым адкрыцці Форуму выступілі прадстаўнікі найважнейшых інтэграцыйных структур постсавецкай прасторы. У сваім дакладзе дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА адзначыў, што мэтай інтэграцыі (і асабліва інтэграцыі на постсавецкай прасторы) з'яўляецца дасягненне такога стану рэчаў, калі людзі з розных краін у адпаведных краінах-партнёрах не адчуваюць сябе замежнікам. І на гэтым шляху менавіта Саюзная дзяржава дасягнула найбольшых поспехаў, стварыўшы не толькі адзіныя мытную і эканамічную прасторы, але і адзіную сацыяльную прастору.

Свой погляд на інтэграцыйныя працэсы прадставіла член Еўразійскай эканамічнай камісіі (міністр) Таццяна ВАЛАВАЯ. Выступаючы перад аўдыторыяй, яна адзначыла сінхроннасць працэсаў еўрапейскай і еўразійскай інтэграцыі. Менавіта ў снежні 1991 года былі заключаны не толькі Белавежскія пагадненні, але і завершаны апошнія кансультацыі па Маастрыхцкай дамове, якой быў заснаваны Еўрапейскі саюз. На думку Таццяны Валавой, ужо Белавежскія пагадненні, якія афармілі разбурэнне Савецкага Саюза і фарміраванне Садружнасці Незалежных Дзяржаў, былі пачаткам еўразійскай інтэграцыі. І сутнасць гэтага працэсу ў тым, што краіны Еўразійскага саюза спрабуюць рэалізаваць пры стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза еўрапейскую мадэль інтэграцыі.

Падчас урачыстага адкрыцця ФЕАМ таксама выступілі намеснік старшыні Камітэта па справах СНД і сувязях з суайчыннікамі Дзяржаўнай Думы Расійскай Федэрацыі Таццяна Маскалькова, намеснік міністра сувязі і масавых камунікацый Расіі Аляксей Волін, дырэктар Парку высокіх тэхналогій Валерый Цапкала, старшыня Беларускага саюза журналістаў, галоўны рэдактар газеты «Рэспубліка» Анатоль Лемяшонак.

Пасля завяршэння адкрыцця дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота правёў брыфінг, прысвечаны пасяджэнню Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, маючаму адбыцца 12 снежня 2012 года. На пасяджэнні будуць разгледжаны 33 пытанні парадку дня, уключаючы пытанні стварэння Адзінай энергетычнай прасторы і Адзінай транспартнай прасторы, шэраг саюзных праграм. Усяго ў цяперашні час на разгляданні ў Пастаянным камітэце знаходзіцца каля 20 праектаў саюзных праграм.

На думку Рыгора Рапоты, у 2013 годзе ў рамках Саюзнай дзяржавы будуць разглядацца пытанні, звязаныя з далейшым фарміраваннем адзінай сацыяльнай прасторы Беларусі і Расіі. У прыватнасці, вялікі інтарэс трэціх краін выклікае пытанне ўвядзення так званай «саюзнай візы», якая дазволіла б грамадзянам іншых краін знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі пасля атрымання расійскай візы і наадварот.

Пасля брыфінгу ўдзельнікі Форуму атрымалі магчымасць падрабязна падыскутаваць пра лёсы еўразійскай інтэграцыі са спецыяльным госцем ФЕАМ-2012 — дырэктарам Інстытута эканомікі Расійскай акадэміі навук, членам-карэспандэнтам Расійскай акадэміі навук Русланам Грынбергам.

Даволі палемічны даклад эксперта выклікаў неадназначную рэакцыю публікі. Руслан Грынберг адназначна далучыўся да пазіцыі Таццяны Валавой пра змест еўразійскай інтэграцыі: яна з'яўляецца спробай рэалізаваць на еўразійскай прасторы еўрапейскую мадэль інтэграцыі. Пры гэтым, на думку эксперта, стварэнне і паўнавартасная праца Еўразійскага саюза немагчымыя без удзелу ў гэтым фарміраванні Украіны.

Дарэчы, самі прадстаўнікі Украіны задавалі Руслану Грынбергу пытанні аб тым, якім чынам Кіеў можа ўсё ж такі пазбегнуць членства ў Еўразійскім саюзе, але пры гэтым актывізаваць эканамічнае ўзаемадзеянне з удзельнікамі гэтага ўтварэння. У прыватнасці, пад пытаннем апынулася прамысловая палітыка Расіі, якая ў цяперашні час не здольная прапанаваць украінскім партнёрам колькі-небудзь рэальную перспектыву сумеснага развіцця.

Праграма Форуму ўключае ў сябе пленарныя пасяджэнні і дыскусійныя сесіі. Таксама ў Мінску адбудзецца ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу «Лепшы медыяпраект ФЕАМ-2012». Рашэнне аб правядзенні гэтага конкурсу па выніках папярэдняга медыяфоруму прынялі агенцтва РІА «Навіны» і МТРК «Мір». Удзельнікаў Форуму чакае таксама жорсткая дыскусія «Сценка на сценку» на тэму «Інтэрнэт: бязмежнасць інфармацыі і межы свабоды».

Юрый ЦАРЫК.

Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ:

«ПАТРЭБА МІЖДЗЯРЖАЎНЫХ СТАСУНКАЎ ВЕЛЬМІ ВЫСОКАЯ»

— Маё асабістае меркаванне — цалкам ад дзяржаўнай падтрымкі ўсе СМІ адмовіцца не змогуць, — заявіў журналістам, удзельнікам Форуму еўрапейскіх і азіяцкіх медыя (ФЕАМ)-2012 **міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ**. — Ёсць буйныя выданні, якія нясуць дзяржаўную нагрузку: яны вымушаны друкаваць афіцыйную інфармацыю. Фінансаванне дзяржаўных СМІ ў Беларусі — гэта не падтрымка нават, а дзяржаўны заказ на публікацыю афіцыйнай інфармацыі. Дзяржава просіць, каб гэтую інфармацыю апублікавалі, і гарантуе за гэта частковае фінансаванне. Пры гэтым ільвіную долю СМІ зарабляюць самастойна.

Алег Пралясковскі адзначыў, што форумы кшталту ФЕАМ — вельмі карысныя для развіцця інфармацыйнай прасторы ва ўсім свеце. «Мы бачым, што патрэба зносін у людзей і грамадства, міждзяржаўных стасункаў, культурных, спартыўных, гуманітарных, — вельмі высокая. Журналісты гэта востра адчуваюць і таму збіраюцца на падобныя сустрэчы. Як міністр інфармацыі, вельмі рады, што такія форумы адбываюцца ў Мінску. У тым ліку і традыцыйныя сустрэчы Прэзідэнта Беларусі з прадстаўнікамі замежных СМІ, і выстаўкі СМІ Беларусі, і міжнародны медыяфорум. У наступным годзе плануем правесці сусветны кангрэс рускай прэсы», — сказаў ён.

У 2013 годзе Беларусь будзе старшынстваваць у СНД; у Мінску змешчана штабкватэра СНД; больш за тое, кіраўнік Беларусі з'яўляецца паслядоўным прыхільнікам інтэграцыі, нагадаў міністр інфармацыі Беларусі. Таму Мінск заўсёды адкрыты для правядзення падобных мерапрыемстваў, а Міністэрства інфармацыі гатова садзейнічаць іх рабоце.

— Мы — краіны Садружнасці Незалежных Дзяржаў — вельмі блізкія і, разам з тым, розныя. У кожнай ёсць свае асаблівасці і ў заканадаўстве, і ў дачыненні да журналістыкі. Важна, што на ФЕАМ прысутнічаюць не толькі журналісты, але і кіраўніцтва міністэрстваў, адказных за медыяпрастору. Мы правялі перамовы з расійскімі калегамі, з якімі ў нас сяброўскія адносіны. Размова тычылася ўдзелу Расіі ў XX Міжнароднай Мінскай кніжнай выставе-кірмашы, дзе яна будзе ганаровым госцем, удзелу нашых міністэрстваў на пасяджэнні Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы ў сераду.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ВЯСКОВЫ ПРАДПРЫМАЛЬНІК УЗДЫХНЕ ЛЯГЧЭЙ

Аб стварэнні спрыяльных умоў для развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў малых гарадах і сельскай мясцовасці вялася размова падчас пасяджэння «круглага стала» прэс-цэнтра Дома прэсы з удзелам прадстаўнікоў Мінэканомікі, падатковай галіны, Дзяржаўнага мытнага камітэта і банкаўскага сектара Беларусі.

Шарэнгі прадпрымальнікаў растуць

— Сёння галоўным дакументам, які вызначае асаблівасці дзейнасці прадпрымальніцкай дзейнасці ў рэгіёнах, з'яўляецца Дэкрэт Прэзідэнта Беларусі № 6 «Аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці, — расказвае **намеснік начальніка ўпраўлення развіцця прадпрымальніцтва Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Ірына БАБАЧОНАК.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гэты дакумент быў падрыхтаваны пры ўзаемадзеянні ўласных структур і бізнэсу, дзе былі замацаваны беспрэцэдэнтныя льготы для арганізацыі «сваёй справы» на вызначаных тэрыторыях. Маецца на ўвазе пакет прэферэнцый падатковага, фінансавага і маёмаснага характару, што дае магчымасць развіваць эканоміку рэгіёнаў больш эфектыўна.

У прыватнасці, дэкрэтам вызначаны рэжым, які прадугледжвае вызваленне суб'ектаў гаспадарання ў першыя 7 гадоў сваёй дзейнасці ад падатку на прыбытак, падаходнага падатку, падатку на нерухомасць. Акрамя таго, пры выкананні пэўных умоў такія прадпрымальнікі маюць магчымасць не адлічваць грошы ў інавацыйны фонд, вызваляюцца ад аплаты дзяржаўнай пошліны па пэўных ліцэнзійных працэдурах, ад абавязковага продажу валютнай выручкі. Цяпер вясковы бізнэс самастойна вызначае ўмовы, аб'ёмы і віды сыравіны, якая набываецца, камплектуючых матэрыялаў, а таксама аб'ёмы і ўмовы рэалізацыі прадукцыі ўласнай вытворчасці.

Дэкрэтам № 6 дазваляецца карыстацца агучаным пакетам прэферэнцый не толькі суб'ектам гаспадарання, якія зарэгістраваны на тэрыторыі малых гарадоў і сельскай мясцовасці, але і арганізацыям з «прапіскай» у буйных гарадах, што маюць у рэгіёнах адасобленыя структурныя падраздзяленні.

Гэты дакумент дазваляе прадпрымальніцкім структурам у рэгіёнах набываць нерухомую маёмасць без афармлення права на заключэнне дагавора арэнды на зямельны ўчастак, дзе знаходзіцца такая нерухомасць. Пры набыцці такой нерухомасці суб'екты малога і сярэдняга бізнэсу цяпер могуць разлічваць на растэрміноўку плацяжоў тэрмінам на 5 гадоў, калі гэта нерухомасць выкарыстоўваецца па мэтавым прызначэнні.

Ірына Бабачонак адзначыла, што дэкрэт № 6 замацаваў магчымасць фінансавання рэспубліканскім бюджэтам выдаткаў па стварэнні інфраструктуры ў рэгіёнах.

Дадатковым кірункам у дэкрэце акрэсліваецца стварэнне спрыяльных умоў для развіцця рамесніцкай дзейнасці на вёсцы і ў малых гарадах. Цяпер рамесніцкая дзейнасць не абмяжоўваецца да прадпрымальніцкай і ажыццяўляецца па заяўным прынцыпе без дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў. Неабходна толькі стаць на ўлік у падатковым органе і заплаціць спецыяльны збор у памеры адной базавай велічыні. Такі збор аплачваецца адзін раз у год. Рамеснікі не плацяць падаходны падатак і адзіны падатак з індывідуальных прадпрымальнікаў. Пералік відаў дзейнасці рамесніцтва пастаянна пашыраецца, што дазваляе максімальна задзейнічаць у гэтым працэсе насельніцтва.

Так, калі ў 2010 годзе рамесную дзейнасць у краіне ажыццяўлялі 4319 чалавек, то, згодна з вынікамі аператыўнага маніторынгу, па стане на 1 кастрычніка 2012 года ў Беларусі было зарэгістравана ўжо 7175 рамеснікаў.

Спадарыня Бабачонак удакладніла, што дэкрэт № 6 пачаў дзейнічаць толькі з ліпеня гэтага года, таму рабіць высновы аб эканамічным эфекце яго рэалізацыі пакуль зарана. Разам з тым, паказальным з'яўляецца той факт, што тэмп росту колькасці суб'ектаў прадпрымальніцтва з 1 ліпеня да 1 кастрычніка сёлета на тэрыторыі малых гарадоў і сельскай мясцовасці склаў 2,1%.

Хто атрымае падатковыя льготы?

Асноўныя падатковыя прэферэнцыі для прадпрымальніцкіх структур у малых гарадах і на вёсцы датычацца льгот па падатку на прыбытак, атрыманы ад рэалізацыі тавараў, работ і паслуг уласнай вытворчасці і льготы па падатку на нерухомасць, якая знаходзіцца ў вызначанай мясцовасці. Акрамя гэтага, як патлумачыла **галоўны дзяржаўны падатковы інспектар галоўнага ўпраўлення метадалогіі падаткаабкладання арганізацый Міністэрства па падатках і зборах Алена САХАРУК,** падобныя падатковыя льготы могуць атрымаць і камерцыйныя арганізацыі, што зарэгістраваны на тэрыторыі г. Мінска і ў якіх скончыўся 7-гадовы тэрмін пасля іх дзяржрэгістрацыі, калі апошнімі былі створаны філіялы ў малых гарадах і сельскай мясцовасці. У гэтым выпадку такія філіялы павінны самастойна аплачваць падаткі (з улікам ільгот), зборы і пошліны ў бюджэт.

Каб атрымаць ільготу па падатку на прыбытак, плацельшчыкі абавязаны звярнуцца ў гандлёва-прамысловую палату і атрымаць сертыфікат работ, паслуг уласнай вытворчасці або сертыфікат прадукцыі ўласнай вытворчасці. Ільгота па падатку на прыбытак даецца выключна толькі па тых таварах і паслугах, калі яны былі створаны ў перыяд дзейнасці гэтых сертыфікатаў. Такія сертыфікаты неабходна прадастаўляць у падатковыя органы.

Пры грузаперавозках і перавозках пасажыраў аўтамабільным транспартам дэкрэтам № 6 прадугледжаны асаблівы парадак прадастаўлення льготы па падатку на прыбытак. Акрамя абавязковай сертыфікацыі такіх работ і паслуг, прадпрымальніцкія структуры павінны рэгістраваць свае транспартныя сродкі ў ДАІ на тэрыторыі малых гарадоў і сельскай мясцовасці.

Малому бізнэсу патрэбны грошы

Белаграпрамбанк з'яўляецца універсальнай фінансавай установай, якая аказвае поўны спектр банкаўскіх паслуг менавіта суб'ектам прадпрымальніцтва ў малых гарадах і сельскай мясцовасці.

Як адзначае **начальнік аддзела кліенцкага менеджменту ўпраўлення карпаратыўнага бізнэсу адкрытага акцыянернага таварыства «Белаграпрамбанк» Аляксандр АНАЦКА,** каля 20 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў і 17 тысяч юрыдычных асоб, якія адносяцца да суб'ектаў малога прадпрымальніцтва, вырашаюць свае фінансавыя пытанні з дапамогай гэтага банка. Толькі за тры кварталы гэтага года банк аказаў фінансавую дапамогу структурам малога прадпрымальніцтва на суму звыш 685 мільярдаў рублёў. Крэдытная падтрымка малога прадпрымальніцтва ажыццяўляецца банкам па трох кірунках. Гэта крэдытаванне на агульных умовах; па лініі мікракрэдытавання з выкарыстаннем спрошчанай працэдуры разгляду хадайніцтва аб выдачы крэдыту, а таксама льготнае крэдытаванне суб'ектаў малога прадпрымальніцтва, якія рэалізуюць імпартазамяшчальныя і экспартаарыентаваныя праекты, па стаўцы ў памеры паловы стаўкі рэфінансавання плюс 3%.

Паводле інфармацыі на пачатак кастрычніка, сёлета запазычанасць па крэдытах Белаграпрамбанка маюць 206 індывідуальных прадпрымальнікаў і 1168 суб'ектаў малога прадпрымальніцтва.

Сяргей КУРКАЧ.

КАЛІНІНГРАДСКАЯ ВОБЛАСЦЬ: ПАРТНЁРСТВА З БЕЛАРУССЮ

Калінінградцы, як слушна адзначаў Прэзідэнт Беларусі, не чужыя нам людзі. Па выніках Усерасійскага перапісу насельніцтва 2010 года беларусамі сябе назвалі 32 з паловай тысячы жыхароў Калінінградскай вобласці. Жывуць у самым заходнім рэгіёне Расіі і дзясяткі тысяч жыхароў, цесна звязаных з Беларуссю сваяцкімі сувязямі. Усяго ў вобласці пражывае 955 тысяч жыхароў.

Важнасць стратэгічнага супрацоўніцтва з Беларуссю для Калінінградскай вобласці заключаецца яшчэ і ў тым, што ў рамках Саюзнай дзяржавы беларускія гарады намнога бліжэй да вобласці, чым расійскія. Для параўнання, бліжэйшы абласны цэнтр Расіі (Пскоў) знаходзіцца ад Калінінграда за 800 км, а Мінск — толькі за 510 км. Варта ўзгадаць, як у 1990-х, калі цэнтральная ўлада ў Расіі аслабла, прадстаўнікі некаторых еўрапейскіх дзяржаў адкрыта абмяркоўвалі пытанні аб вылучэнні Калінінградскай вобласці са складу Расійскай Федэрацыі для трансфармацыі ў самастойную дзяржаву або для ўваходжання ў склад іншых дзяржаў. Для прадухілення падобных сцэнарыяў такая блізкасць Беларусі да Калінінградскай вобласці мае для расійскага кіраўніцтва сапраўды стратэгічнае значэнне.

Нягледзячы на параўнальна невялікае насельніцтва вобласці, патэнцыял эканамічнага супрацоўніцтва з Беларуссю ў наяўнасці. Так, па выніках 2011 года тавараабарот Калінінградскай вобласці з Рэспублікай Беларусь склаў 126,7 млн дол. ЗША і вырас у параўнанні з 2010 годам на 10%. Пры гэтым беларускі экспарт дасягнуў лічбы 73,6 млн дол. ЗША. Улічваючы, што такі памер знешнегандлёвага абароту Беларуссю не дасягнуты з шэрагам намнога больш населеных абласцей Расіі, гэта сведчыць пра сур'ёзныя поспехі ў эканамічным супрацоўніцтве.

Для далейшага развіцця супрацоўніцтва неабходна ўзмацніць каардынацыю ў рэалізацыі ўзаемавыгадных праектаў. Менавіта з гэтай мэтай дэлегацыя Калінінградскай вобласці Расіі на чале з губернатарам Мікалаем Цуканавым наведала нашу краіну на мінулым тыдні. Праграма работы дэлегацыі была вельмі напружанай. Перш за ўсё, зразумела, адбылася сустрэча з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Калінінградская вобласць у пасляваенныя гады «стала родным домам для беларускага народа». Ён запэўніў членаў дэлегацыі: «Мы заўсёды будзем дзяліцца з калінінградцамі ўсім, чым толькі можам. Ваш рэгіён і Рэспубліка Беларусь — блізкія і надзейныя партнёры. Мы ўдзячныя за супрацоўніцтва і за тыя прыёмы, што вы аказваеце нашым дэлегацыям, якія прыязджаюць у Калінінградскую вобласць». У выступленні ў адказ губернатар Калінінградскай вобласці адзначыў, што паміж вобласцю і рэгіёнамі Рэспублікі Беларусь актыўна развіваецца супрацоўніцтва ва ўсіх жыццёва важных сферах, пры гэтым надаецца вялікае значэнне ўмацаванню сувязяў у транспартнай і будаўнічай галінах, у галіне сельскагаспадарчай вытворчасці і культуры.

Новыя перспектывы супрацоўніцтва бакі звязваюць з правядзеннем у Калінінградзе чэмпіянату свету па футболе ў 2018 г. У сувязі з гэтай падзеяй вобласць чакае сур'ёзны прыток інвестыцый, якія дазволяць змяніць яе воблік. Адным з кірункаў з'яўляецца мадэрнізацыя транспартнай сістэмы. Як паведаміў губернатар Мікалай Цуканаў, вобласць разглядае магчымасць запуску хуткаснай веткі ў горадзе да чэмпіянату свету, і супрацоўніцтва ў гэтай сферы з нашай краінай вельмі прывабнае. Беларуссю было прапанавана разгледзець магчымасць арганізацыі ў Калінінградзе руху хуткасных электрацягнікоў у сувязі з тым, што хутка пачне работу сумесная беларуска-швейцарская вытворчасць гарадскіх электрацягнікоў.

Мікалай Цуканаў таксама звярнуўся да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай разгледзець магчымасць працягнення чыгуначнай веткі Мінск—Вільнюс ад сталіцы Літвы да Калінінграда. Прэзідэнт Беларусі паабяцаў абмеркаваць гэту тэму з кіраўніком адкрытага акцыянернага таварыства «Расійскія чыгункі» Уладзімірам Якуніным, чый візіт у Мінск плануецца ў бліжэйшы час. Губернатар Калінінградскай вобласці праінфармаваў Прэзідэнта, што рэгіянальныя ўлады гатовы выдзеліць участак зямлі на ўзбярэжжы для будаўніцтва беларускага пансіяната. Ён таксама паведаміў, што плануе пабудаваць з улікам беларускага вопыту ў Калінінградскай вобласці аграгарадок.

Акрамя сустрэчы з Прэзідэнтам, калінінградская дэлегацыя ўзяла ўдзел у дзясятым юбілейным пасяджэнні Расійска-Беларускага Савета, створанага ў 2000 годзе. Яго мэтай было вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па пашырэнні супрацоўніцтва. Губернатар Калінінградскай вобласці выказаў зацікаўленасць у пераарыентацыі беларускіх грузаў з прыбалтыйскіх кірункаў на партовую інфраструктуру Калінінградскай вобласці, а таксама прапанаваў абмеркаваць удзел беларускага боку ў праекце будаўніцтва глыбакаводнага порта. Зноў абмяркоўваліся і пытанні ўдзелу Беларусі ў падрыхтоўцы да чэмпіянату свету 2018 года. Беларускі бок выказаў гатоўнасць павялічыць пастаўкі цэменту ў рэгіён у сувязі з уводам новых магутнасцяў пасля маштабнай рэканструкцыі айчынных цэментных заводаў, увесці будаўніцтва спартыўных, сацыяльных і культурных аб'ектаў на канкурснай аснове. Першы намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Уладзімір Сямашка адзначыў зацікаўленасць беларускага боку ва ўдзеле ў мадэрнізацыі інфраструктуры Калінінградскай вобласці і абнаўленні парку грамадскага транспарту. Сур'ёзная ўвага была нададзена абмеркаванню перспектыў удзелу Беларусі ў стварэнні аўтамабільнага кластара ў Калінінградскай вобласці. Беларуссю былі ўнесены наступныя прапановы: спраектаваць і пабудаваць «пад ключ» аўтазборачныя заводы, або пастаўляць у Калінінград прадукцыю беларускага холдынга «Аўтакампаненты», пры гэтым магчыма стварэнне сумеснага прадпрыемства ў рэгіёне. Прадстаўнікамі Беларусі было таксама прапанавана садзейнічанне ў перападрыхтоўцы ўрачоў з Калінінграда з улікам перадавога вопыту беларускіх медыкаў. Акрамя таго, была дасягнута дамоўленасць, што з наступнага года беларускія студэнцкія атрады будуць запрошаны ў Калінінградскую вобласць для працы на сацыяльна важных аб'ектах.

Пратакол пасяджэння Савета быў падпісаны 4 снежня ў час сустрэчы губернатара вобласці з прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь. У час яе Мікалай Цуканаў адзначыў, што «Калінінградская вобласць разлічвае на падтрымку Беларусі ў мадэрнізацыі эканомікі» і што ён прапаноўвае падвоіць тавараабарот у бліжэйшы час.

Сяргей КІЗІМА, загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук.

НАВІНЫ

САМАЛЁТ ПАЙШОЎ НА ВЫМУШАНУЮ

Апоўдні ў нядзелю дыспетчар службы пажарнага і аварыйна-выратавальнага забеспячэння Нацыянальнага аэрапорта «Мінск» паведаміў пра аварыйную пасадку пасажырскага Аэробуса А-319 авіякампаніі Air France, які ляцеў рэйсам Парыж — Масква.

На борце паветранага судна знаходзіліся 90 пасажыраў і 6 членаў экіпажа. Падчас разбору сітуацыі высветлілася, што на вышыні 10 тысяч метраў пілоты выявілі няспраўнасць: разгерметызацыю салона самалёта. У 12.09 паветраны борт паспяхова прызямліўся. Пацярпелых не было. Пасля пасажыры вылецелі па сваім маршруце.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАДЗЕІ

ДЗЕ РЫХТУЮЦЬ ЛЕПШЫХ БІЁЛАГАЎ?

Студэнты біялагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта занялі абсалютнае першае месца на II Міжнароднай біялагічнай універсіядзе. Універсіяда праходзіла ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. Ламаносава па ініцыятыве яго рэктара акадэміка Віктара Садоўнічага.

У спаборніцтвах узялі ўдзел 16 камандаў з Расіі, Украіны і Беларусі. А перамога дасталася камандзе БДУ, за якую выступалі пяцікурснікі Кацярына Кастагладава і Аксана Кірсанава, чацвёртакурснікі Антон Кавалеўскі і Арцём Маргуноў і трэцякурснік Андрэй Сухарэўскі. Падрыхтоўкай студэнтаў займаўся дацэнт кафедры генетыкі біяфака БДУ Васіль Грынёў. Дарэчы, у камандзе пераможцаў былі вопытныя «байцы», якія яшчэ ў школьныя часы займалі прызавыя месцы на міжнародных алімпіядах школьнікаў па біялогіі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДАМАВЫ ХРАМ КАЛЯ КАЛОЖЫ

У Гродне асвечаны дамавы храм у гонар Каложскага абраза Божай Маці і царкоўнапрыходскі комплекс пры Свята-Барыса-Глебскай (Каложскай) царкве з хрысцільняй, класамі нядзельнай школы і бібліятэкай.

Яны пабудаваны дзякуючы спонсарскай дапамозе Белаграпрамбанка, які выдаткаваў на дабрую справу 5,5 мільярда рублёў. Архіепіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Арцемій уручыў вышэйшую ўзнагароду Гродзенскай епархіі — медаль «Каложскі Крыж 3 ступені» старшыні праўлення ААТ «Белаграпрамбанк» Уладзіміру Падкавыраву. Царкоўнымі ўзнагародамі, акрамя спонсараў, таксама адзначаны і прыхаджане, якія актыўна ўдзельнічалі ў будаўніцтве.

Свята-Барыса-Глебская царква, як вядома, не ацяпляецца. Таму з гэтага часу зімой набажэнствы будуць там праходзіць па нядзельных днях, а ў астатнія — у дамавым храме. Пры гэтым Каложа будзе па-ранейшаму пастаянна адчынена для наведнікаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ФАКТЫ

БЯЗДОМНЫЯ ШУКАЮЦЬ ЦЯПЛО

Сапраўднае снежаньскае надвор'е, якога многія так чакалі, зусім не радуе асоб, што не маюць даху над галавой. Жыхары гарадскіх задворкаў, пад'ездаў і падвалаў з надыходам халадоў шукаюць, дзе б «перазімаваць». У дзяржустанове «Дом начнога знаходжання асоб без пэўнага месца жыхарства», што знаходзіцца ў Мінску на вуліцы Ваўпшасава, большая частка месцаў ужо занятая.

— Пакуль што ў нашу ўстанову, якая разлічана на 92 месцы, звярнуўся 81 чалавек, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» дырэктар Дома начнога знаходжання асоб без пэўнага месца жыхарства Мікалай Вяркееў. — У большасці выпадкаў бяздомныя прыходзяць «зімаваць» самастойна і добраахвотна. Бывае, што параяць звярнуцца да нас у бальніцы ці ў міліцыі. Сілай нікога не трымаем.

Па словах Мікалая Міхайлавіча, Дом начнога знаходжання запоўнены цалкам, як правіла, у самыя халодныя месяцы года. Колькі сродкаў давядзецца патраціць на ўтрыманне аднаго бяздомнага зімой, пакуль сказаць цяжка. Але, напрыклад, у кастрычніку на дзень для аднаго чалавека выдаткоўвалася сума ў 93 тысячы рублёў. За месяц выходзіць больш за 2 мільёны рублёў.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

НАВІНЫ

«ДУША, АДКРЫТАЯ СВЕТУ»

Пад такой назвай праходзіць у Гродзенскай выставачнай зале абласная выстава творчых работ маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

На ёй прадстаўлены малюнкі, вышыўка, аплікацыі, вырабы з бісеру, кардону і іншых матэрыялаў. Усё гэта створана ў аддзяленнях дзённага знаходжання для інвалідаў. Такія аддзяленні адкрыты пры цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ва ўсіх раёнах вобласці і ў Гродне. Сёння іх на пастаяннай аснове наведваюць 576 чалавек. Там створана шмат гурткоў, клубаў па інтарэсах, а таксама 16 рэабілітацыйна-працоўных майстэрняў. Напрыклад, сёлета ў Лідскім і Свіслацкім раёнах адкрыліся творчыя майстэрні па вырабе сувенірнай прадукцыі, у Дзятлаўскім — майстэрня «Сакрэты дамашняй гаспадаркі», у Смаргонскім — швейная, у Астравецкім раёне — майстэрня «Мылавар».

Дарэчы, калі ў першай абласной выставе творчых работ інвалідаў удзельнічала 5 аддзяленняў іх дзённага знаходжання, то цяпер — ужо 10.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПАДЗЕІ

ДАДАТКОВЫЯ АЎТОБУСЫ Ў МАСКВУ

У перадсвяточныя навагоднія дні па міжнародным маршруце Мінск — Масква запланаваны дадатковыя рэйсы адпраўленнем з нашай сталіцы.

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», адзін з такіх рэйсаў будзе выконвацца 26, 27 і 28 снежня ад АВ «Цэнтральны» ў 19.10, ад АВ «Маскоўскі» — у 19.40. У гэтых выпадках абслугоўванне будзе весціся аўтобусам «МАЗ-152» умяшчальнасцю 45 пасажырскіх месцаў. Таксама 27 і 28 снежня пасажыры змогуць паехаць з Мінска ў Белакаменную: ад АВ «Цэнтральны» ў 19.40, ад АВ «Маскоўскі» — у 20.10 (будуць пададзены аўтобусы «МАЗ-251» умяшчальнасцю 42 пасажырскія месцы).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ФАКТЫ

РЫБАКІ ПАТАНУЛІ

У Пастаўскім раёне на возеры Халосенскае патанулі два рыбакі. Калі гэтыя аматары зімняй рыбалкі пачалі тануць, трое іншых спрабавалі іх выратаваць.

На жаль, нічым не дапамаглі — толькі самі апынуліся ў водным палоне.

— Аматараў зімовай рыбалкі нішто не палохае, нават тое, што кожны год на тонкім лёдзе гінуць людзі, канстатуюць у Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. Зараз разглядаецца пытанне аб прыцягненні «аматараў экстрыму» да адміністрацыйнай адказнас

■ Як жывяце, землякі?

У РЭГІЁНЕ

Брэстчына

КЛЮЧЫ АД АЎТАМАБІЛЯЎ — УЧАСТКОВЫМ

У Пінску адбылося пашыранае пасяджэнне супрацоўнікаў прафілактычных службаў органаў унутраных спраў

Тэма — паляпшэнне работы ўчастковых інспектараў міліцыі па справах непаўналетніх і прафілактыцы правапарушэнняў з удзелам старшыні Брэсцкага аблвыканкама Канстанціна Сумара.

Па традыцыі на такім штогадовым пасяджэнні адзначаюць лепшых міліцыянераў і актыўных членаў народных дружын. Многія атрымалі граматы, каштоўныя падарункі, лісты падзякі. А лепшым участковым губернатар уручыў ключы ад новых службовых аўтамабіляў. Машыны атрымалі Андрэй Забаўнюк з Пінска, Аляксандр Зяньковіч з Баранавіч, Аляксандр Коржук, супрацоўнік Жабінкаўскага РАУС, Генадзь Сідарэнка з Маларыты і Іосіф Дзямідзік, участковы з Брэсцкага раёна.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ВАГОНЫ СЫШЛІ З РЭЕК

На станцыі «Баранавічы-Цэнтральныя» сышлі з рэек тры чыгуначныя вагоны

Здарэнне мела месца каля 20 гадзін вечара ў нядзелю. Пры перастаноўцы саставу з 74 вагонаў лакаматывам з 49-га пуці Мінскага няцотнага парка ў Заходні парк станцыі «Баранавічы-Цэнтральныя» адбылася самарасчэпка вагонаў.

— У выніку тры з іх сышлі з рэек і перакуліліся. У двух вагонах быў вугаль, яшчэ ў адным — жалезабетон, — паведамілі старшы інспектар цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Наталля Скрабец. — Былі пашкоджаны 30 метраў чыгуначнага палатна пуці №5 Цэнтральнага парка, парушаны габарыты руху па першым галоўным пуці станцыі «Баранавічы-Цэнтральныя». Пацярпелых не было, збояў у руху іншых паяздоў не зафіксавана. Работы па ачыстцы першага чыгуначнага пуці былі завершаны ў 3.00.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Гомельшчына

З БАНКАМ ШКОЛЕ ВЕСЯЛЕЙ

Пасля рэканструкцыі ў горадзе Тураве Жыткавіцкага раёна ўрачыста адкрылася сярэдняя школа №1

Усе работы пачаліся сёлета ў сярэдзіне ліпеня і вяліся паскоранымі тэмпамі. Грошы на будоўлю з'явіліся пасля таго, як кіраўніцтва Белаграпрамбанка падрабязна пазнаёмілася з умовамі, у якіх вучацца дзеці работнікаў іх падшэфнай сельскай гаспадаркі «Тураўшчына».

Дарэчы, для рэканструкцыі школы Белаграпрамбанк выдаткаваў 7 млрд рублёў, а генеральным падрадчыкам аб'екта выступіла Жыткавіцкае ПМК-76. Пакуль вяліся будаўнічыя работы, усе 244 вучні разам з настаўнікамі займаліся ў тураўскай школе №2 — у дзве змены. Як расказаў намеснік старшыні Жыткавіцкага райвыканкама Валерый Рагалевіч, за пяць месяцаў у тураўскай школе №1 рэканструявалі блок харчавання, спартыўную залу, адкрылі актавую і трэнажорную залы, абсталявалі ўнутраныя санітарныя вузлы, цалкам адрамантавалі кабінеты і рэкрэацыі. Больш за тое, у адноўленай установе адукацыі ўсталявалі новае тэхналагічнае абсталяванне, новую мэблю ва ўсіх кабінетах, закупілі неабходны новы спартыўны інвентар і турыстычны рыштунак.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Гродзеншчына

ГІЯЦЫНТ АЧЫСЦІЦЬ АЗЁРЫ

Прадукцыя Гродзенскай агародніннай фабрыкі дазволіць падоўжыць купальны сезон на беларускіх вадаёмах

Спецыялісты прадпрыемства ўжо ў наступным годзе плануюць ачысціць некалькі вадаёмаў пры дапамозе раслін і рыб, выгадаваных на фабрыцы. У міжсезонне, калі асноўная прадукцыя — агуркі і памідоры — не вырошчваецца, на агародніннай фабрыцы рыхтуюцца здымаць іншы, важны для эканомікі прадпрыемства ўраджай. Кіпіць работа па пераабсталяванні былога будынка біялагічнай лабараторыі фабрыкі ў рыбны цэх і «інкубатар» для новай у нашых шыротах расліны — воднага гіяцынту, ці, па-навуковаму кажучы, эйхарніі.

Сярод уласцівасцяў, якія прыпісваюцца гэтай расліне, — нават здольнасць раскладання ракетнага паліва гептылу. А вось здольнасць прыбраць з паверхні вады нафтапрадукты і ачысціць акваторыю ад арганічных забруджванняў ужо даказана на практыцы ў суседніх краінах.

Бліжэйшым летам эйхарнія будзе высаджана на Юбілейным возеры. Паводле разлікаў, дзякуючы расліне возера не трэба будзе закрываць у разгар купальнага сезона, як гэта адбываецца амаль кожны год. Вада адназначна стане чысцейшай. Змагацца з залішняй расліннасцю, забалочваннем і «фільтраваць» глей будуць амур і таўсталобік з уласнага рыбапасеўнага матэрыялу.

Антон ЗАПОЛЬСКІ.

ЗА ЗАБОЙСТВА ЛАСЯ — КРЫМІНАЛЬНЫ АРТЫКУЛ

Браканьер з Лідскага раёна аб'яўлены ў вышук

Пра гэта карэспандэнту **БелТА** паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі.

Работнікі Гродзенскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету сумесна з супрацоўнікамі галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС удзельнічалі ў затрыманні групы браканьераў, якія палявалі на мяжы Лідскага і Навагрудскага раёнаў.

«За лідарам гэтай групы, жыхаром Бярозаўкі, доўгі час вялося назіранне, бо мелася інфармацыя аб яго схільнасці да супрацьпраўных дзеянняў. Пасля таго, як атрымалі інфармацыю, што падазраваны незаконна здабыў лася і шукае аўтамабіль для яго транспартавання, праваахоўнікі накіраваліся да хаты браканьера, каб затрымаць злачынную групу з доказамі злачынства.

Падчас вобыску гаража выяўлена туша лася вагой 530 кг, некалькі пастак, паляўнічыя нажы, чахол ад стрэльбы, а таксама свежыя рэшткі тушы дзіка. Акрамя гэтага, у аўтамабілі браканьераў знойдзены незарэгістраваны пісталет, а ў хаце — замарожанае мяса дзікай жывёлы. Пры вобыску ў дамах меркаваных саўдзельнікаў незаконнага палявання было канфіскавана незарэгістраваная паляўнічая стрэльба. Галоўнаму падазраванаму ўдалося ўцячы. Цяпер ён аб'яўлены ў вышук. Лідскім раённым аддзелам Следчага камітэта ў дачыненні да яго распачата крымінальная справа.

Магілёўшчына

ДАРЫЦЬ РАДАСЦЬ НА РАСТВО — ДОБРАЯ ПРЫКМЕТА

У Бабруйску стартавала дабрачынная акцыя «Падары радасць на Раство»

Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **16 января 2013 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 12.12.2012 по 14.01.2013 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок:
(017) 327 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Пытальнік

ДЗІЦЯЧАЯ ПЛЯЦОЎКА ЗАСТАНЕЦЦА НА РАНЕЙШЫМ МЕСЦЫ

Мы, жыхары Веткі, настойліва просім пакінуць ранейшым месцазнаходжанне дзіцячай пляцоўкі для гульні, пабудаванай па просьбе жыхароў у гарадскім скверы на Краснай плошчы. Нам стала вядома пра неафіцыйны план кіраўніцтва горада, згодна з якім гэтая камбінаваная дзіцячая пляцоўка з некаторымі спартыўнымі элементамі, прызначаная для сямейнага адпачынку, у хуткім часе можа быць перанесена ў іншае месца.

Красная плошча ў Ветцы з'яўляецца гістарычным месцам. Так яна была названая ў XVII стагоддзі і захавала гэтую назву да нашых дзён. Дзіцячая гульнявая пляцоўка, якая займае вельмі невялікае месца ў скверы, — сімвал нашай будучыні, адзін з сімвалаў адраджэння шматпакутнага Веткаўскага «чарнобыльскага» раёна. На працягу некалькіх гадоў — з 2009 года па сённяшні час — гэтая пляцоўка з'яўляецца ідэальным месцам для адпачынку маладых сем'яў з дзецьмі, школьнікаў малодшага, сярэдняга і старэйшага ўзростаў.

...Просім звярнуць увагу на тое, што ў цывілізаваным грамадстве кіраўніцтва раёна (горада) звычайна раіцца з жыхарамі наконт пераўтварэння культурных, гістарычных месцаў. Да ведама: менавіта на Краснай плошчы ў 1960-1980 гадах знаходзілася абсталяваная пляцоўка для дзяцей, што сведчыць пра традыцыю ўважлівага стаўлення да дзетак.

...Прапануем Веткаўскаму райвыканкаму... даць магчымасць жыхарам горада ўзяць афіцыйны ўдзел у абмеркаванні праектаў, скіраваных на культурнае пераўтварэнне горада (у тым ліку на старонках раённай газеты).

БЯЛЯЕВА Г.М., АБРАЗЦОВА В.С., ПАШКОВА Н.У., ДЗЯТЛАВА Д.І., БОВА В.А., ГАСПАДАРАВА А.А., ЯСЬКОВА А.А. (усяго 31 подпіс маці і бабуль).

Чытацкі калектыўны зварот насамрэч нашмат большы па аб'ёме. Заяўнікі даслалі разам з ім выразкі з раённай і абласной газет, фотаздымкі. З-за эканоміі газетнай плошчы мы надрукавалі са звароту толькі вытрымкі, якія датычацца сутнасці справы. Адказаць на зададзеныя гараджанамі пытанні мы папрасілі Веткаўскі райвыканкам.

Як паведамілі рэдакцыі аптуль, быў праведзены сход, падчас якога нязгодныя з пераносам дзіцячай гульнявой пляцоўкі павінны былі атрымаць каментарыі і тлумачэнні. Абмеркаванне вышэйназванага звароту прайшло з удзелам старшыні райвыканкама, намесніка старшыні райвыканкама, які курыруе сацыяльную сферу, начальніка аддзела ідэалагічнай працы райвыканкама, намесніка дырэктара па ідэалагічнай працы КЖУП «Веткаўскае» і грамадзянамі, якія падпісалі калектыўны ліст.

Дэмантаж і перанос дзіцячай пляцоўкі для гульні, размешчанай у парку на Краснай плошчы г.Веткі, у іншае месца горада не плануецца.

Усе работы, які праводзяцца ў горадзе па добраўпарадкаванні і азеляненні, вызначаны планам мерапрыемстваў на 2012 год і зацверджаны рашэннем Веткаўскага раённага выканаўчага камітэта ад 23.03.2012 года №284. Інфармацыя пра гэтыя мерапрыемствы была апублікавана на старонках раённай газеты, таму жыхары Веткаўскага раёна маюць магчымасць абмяркоўваць іх распрацоўку і рэалізацыю.

Такая форма абмеркавання будзе падоўжана і ў далейшым» ■

■ Працяг тэмы

БАБУЛЯ, ПАТРОН ДАВАЙ! або Рамонт з «пераносам»

БАДАЙ, аналаг папулярнага серыяла з элементамі чорнага гумару можна зняць па матывах рэальнай камунальнай гісторыі, якая даўно пачалася ў Віцебску. У самым цэнтры горада, недалёка ад Летняга амфітэатра і плошчы Перамогі ёсць некалькі дамоў, на думку жыльцоў, зусім забытых камунальнікамі.

Пра знак «/» і не толькі

Праблемы дамоў №№ 2, 4/16 і 7/13 на вуліцы Багдана Хмяльніцкага былі абазначаны ў публікацыі «Рамонт з «пераносам» («Звязда» ад 18.09.2012). Дарэчы, насамрэч цікава, чаму ў нумарацыі дамоў з'явіліся гэтыя значкі — «/». Мінскія калегі і зараз не вераць, што такія нумары могуць быць: маўляў, навошта, калі дамы на канкрэтнай вуліцы знаходзяцца? Як карэнны гараджанін магу сказаць, што гэтае «/» — таму, што частка кожнага з дамоў выходзіць на перпендыкулярную вуліцу.

У рэдакцыю пасля публікацыі прыйшоў ліст з Віцебскага гарвыканкама, падпісаны намеснікам старшыні. Па традыцыі там было сказана аб «выхадзе на месца». Наконт таго, што з-за дрэннага стану дахаў і іншых канструкцый некаторыя кватэры залівае, адзначана, што летам такога не было. Праўда, у зімовы перыяд мелі месца выпадкі, калі ў кватэрах з'яўлялася вада.

Паведамлялася таксама, што на даху дома № 4/16 рабочыя пачнуць працаваць у лістападзе. Ужо больш за месяц прайшло, але рабочыя на аб'екце не з'явіліся.

Цяпло трэба берагчы

Валерый Спаткай, пенсіянер, які жыве на верхнім паверсе дома № 4/16 на вуліцы Багдана Хмяльніцкага, быў ініцыятарам напісання артыкула «Рамонт з «пераносам». Дабіўся гэтага, пабываў на прыёме асабіста ў губернатара Віцебшчыны. Было гэта ў пачатку кастрычніка. Дарэчы, пенсіянер вельмі здзівіўся, калі асоба, якая адказвае за запіс на гэтыя прыёмы, сказала яму: маўляў, агучвайце праблемы толькі свайго дома, а не суседніх, пра якія ён таксама хацеў расказаць.

Пенсіянер «падстрахаваўся» і сабраў подпісы жыльцоў пад «даверанасцю», і з паперай гэтай пайшоў у кабінет.

— Дарэчы, прадстаўнікі камунальнай структуры мяне перад візітам да губернатара вельмі прасілі нікуды не хадзіць, — расказвае Валерый Спаткай. — Тады ўгаворвалі і «бегалі» за мной. Маўляў, не хадзі, зробім усё... Шкло памянялі, дзякуй Богу, у пад'ездах, але на цвікі толькі зачапілі, а не замацавалі як трэба. А потым гаварыць будуць, што трэба цяпло берагчы...

Паводле слоў Валерыя Мікалаевіча, губернатар літаральна на другой хвіліне зразумеў сутнасць праблемы і даручыў у бліжэйшы час зрабіць так, каб людзі больш не скардзіліся.

— На прыёме размова ішла аб тым, што трэба вырашыць усе камунальныя пытанні, якія назбіраліся на працягу больш як пяцідзесяці гадоў. Наколькі я зразумеў, было дадзена заданне правесці капітальны рамонт дамоў, пра якія я расказваў, — працягвае Валерый Спаткай.

20 гадоў чакання

— З 1986 года жыву тут. У пад'ездзе холадна было. З выступу над дахам вада сцякае, калі снег растае. Вільгаць трапляе на сценкі дома, зацякае ў вокны, — гаворыць адна са старажылаў дома № 2 на вуліцы Б. Хмяльніцкага. — Звярталіся ў розныя інстанцыі. І пісалі, і тэлефанавалі ў гарвыканкам. Яны нам пасля аднаго са зваротаў ремонт у пад'ездзе зрабілі. Але даўно гэта было... Цяпер вось не працуе на верхнім паверсе вентыляцыя. Майстар прыйшоў, праверыў і паведаміў, што ў нас няправільна вентыляцыйная труба зроблена і яе трэба перакладваць.

— Я ў гэтым доме жыву з 1987 года. І ўжо больш як 20 гадоў не магу дабіцца, каб памянялі патрон для лямпачкі на лесвічнай пляцоўцы. Электрыкі прыходзяць і кажуць: маўляў, давай, бабка, патрон, тады і лямпа будзе гарэць. Я ў адказ: у мяне патрона няма. Лямпачкі па-ранейшаму імгненна перагараюць. Да каго цяпер звяртацца? — скардзіцца яшчэ адна жыхарка. — Патроны ж зараз дарагія, а я на пенсію жыву. Ды і чаму я буду купляць іх? Гэта абавязак камунальнікаў...

Пра кватэру № 13 і... рэкламу

Зайшоў і ў дом № 7/13 на вуліцы Б. Хмяльніцкага. Дарэчы, пры ўваходзе ў пад'езд ногі зламаць можна, бо ступені пад нагамі, а святла няма.

Па словах жыльцоў, з паўночнага боку ў будынак трапляе вільготнасць. Людзі звярталіся ў гарвыканкам. Пасля гэтага сцены цаглянага дома крыху падмазалі, ды ў цэлым нічога не змянілася. «Футра» б яму...

Сёлета, паводле слоў жыльцоў, адкрылі на першым паверсе дома вытворчы цэх рэкламнай канторы. Рэкламныя шчыты пакуль рабілі, дык шумелі, стукалі, фарбавалі... Цяпер цэх не працуе, бо «вайну» з ім незадаволеныя жыльцы выйгралі. Але ў памяшканні былога цэха спецыялісты па рэкламе... зрабілі склад.

— І ходзяць праз наш пад'езд, дзверы адчыняюць, калі захочуць, бо ў іх ненармаваны рабочы дзень. Куды толькі санстанцыя глядзіць?

P.S. *Калі артыкул рыхтаваўся да друку, стала вядома, што губернатар вобласці Аляксандр Косінец даручыў адказным асобам зрабіць усё неабходнае для рамонту вышэйназваных праблемных дамоў на вуліцы Б. Хмяльніцкага.*

Гэта адбылося падчас «прамой лініі», калі жыхары вобласці расказвалі старшыні аблвыканкама аб сваіх праблемах. Пенсіянер Валерый Спаткай таксама патэлефанаваў. Адзін з прысутных адказных асоб у кабінеце аблвыканкама, дзе прымалі званкі, патлумачыў, што затрымка ўзнікла з-за катастрафічнага дэфіцыту грошай. Аляксандр Косінец падкрэсліў у адказ, што яго даручэнне трэба выканаць. Губернатар паабяцаў кіраўніцтву гарвыканкама выдзеліць дадаткова каля 5 мільярдаў рублёў, каб адрамантаваць дахі і ўсё, што неабходна, у праблемных дамах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ ■

Літаральна днямі будаўнікі, як расказаў Валерый Спаткай, урэшце з'явіліся. На даху дома, дзе жыве чытач, рабочыя разабралі старую цагляную трубу. На гэтым пакуль усё. Валерый Мікалаевіч таксама сказаў, што атрымаў ліст, дзе напісана, што ў яго кватэры будзе заменены аконна-дзвярны блок балкона. А што з астатнімі вокнамі? Пра гэта чытач не ведае.

ПА ДРУГІМ КРУЗЕ...

Што прымушае людзей звяртацца да губернатара паўторна?

НЕСВОЕЧАСОВАЕ рэагаванне мясцовых улад на праблемныя пытанні і няпоўнае выкананне даручэнняў губернатара Барыса Батуры вымушае людзей звяртацца да яго паўторна. Гэта ў чарговы раз паказаў выязны прыём грамадзян, які старшыня Мінаблвыканкама правёў у Клецкім раёне.

Першы прыём адбыўся ў рэгіёне 5 мая сёлета. Падчас яго гараджанка Галіна Белая прасіла аб правядзенні ў доме №73 па вуліцы Леніна капітальнага рамонту, паколькі тут зімой холадна, нерэгулярна падаецца гарачая вада. Акрамя таго, як распавяла Галіна Вацлаваўна, у дрэнным стане дваровая тэрыторыя: няма ні пліткі, ні тратуараў.

Губернатар даручыў мясцовым уладам на працягу месяца перадаць дом, які знаходзіўся на балансе Клецкага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя, мясцоваму камунальнаму ўнітарнаму прадпрыемству «Клецкая жыллёва-камунальная гаспадарка», а таксама зрабіць тратуар. З таго часу прайшло восем месяцаў. І вось Галіна Белая паўторна звярнулася да Барыса Батуры, — з ранейшым пытаннем: маўляў, бардзюры зрабілі, а плітку пакласці забыліся.

— Дамы перадалі на баланс у дрэнным стане. Абласное ўпраўленне адукацыі выдзеліла грошы, мы ўжо выканалі работы на суму больш чым 66 млн рублёў, але агульны кошт праекта па добраўпарадкаванні пацягне на 326 млн рублёў у цэнах лістапада 2012 года, — апраўдваўся дырэктар прадпрыемства Аляксандр Навіцкі.

Бясспрэчна, яго зразумець можна, але губернатар праводзіць па раёнах прыёмы не дзеля галачкі, а каб дапамагчы людзям, палепшыць умовы іх пражывання і побыту. «Калі было дадзена даручэнне, то яно павінна быць выканана ў вызначаны тэрмін, вы абяцалі людзям — трымайце слова», — нагадаў губернатар.

Барыс Батура запатрабаваў правесці добраўпарадкаванне да канца года. «Ніякае «але» не прымаецца, дзейнічайце», — сказаў ён. Акрамя таго, кіраўнік вобласці даручыў запланаваць у доме капітальны рамонт на наступны год.

Ніна Юшына, якая жыве побач з Галінай Белай — у доме №71 па вуліцы Леніна ў Клецку, паскардзілася, што ў кватэры не праходзіць вільготнасць, цвіль. Варта дадаць, што ў доме па даручэнні губернатара праведзены рамонт даху, стыкаў — мінулы раз па гэтых праблемах на прыёме пабывала суседка Ніны Міхайлаўны — Наталля Кісялёва.

Па словах Аляксандра Навіцкага, эфект ёсць, проста патрэбен час, каб сцены добра прасохлі — гэтаму паспрыяе ўключанае ацяпленне. «З дапамогай абласнога ўпраўлення ЖКГ правядзём абследаванне будынка і па яго выніках будзем прымаць неабходныя захады», — паабяцаў ён.

Барыс Батура папярэдзіў, каб пытанне трымалі на кантролі і паабяцаў праз два месяцы спецыяльна правесці прыём. «І няхай толькі да мяне прыйдуць тыя ж самыя людзі», — папярэдзіў ён чыноўнікаў. У цэлым жа губернатар выказаў незадаволенасць работай жыллёва-гаспадарчага комплексу раёна і таму даручыць адпаведным службам правесці тут праверку.

Разам з тым падчас прыёму грамадзяне ставілі пытанні, якія маглі б вырашыцца без умяшання губернатара. Напрыклад, Валянціна Русіновіч жыве ў двухузроўневай кватэры: на першым паверсе — кухня, на другім — печка. «Плошчы хапае, але для мяне, чалавека з хворым пазваночнікам, цяжка падымацца па лесвіцы, а тым больш цягаць торф і дровы», — паскардзілася жанчына і папрасіла памяняць жылплошчу. Губернатар параіў мясцовым уладам перавесці жыллё Валянціны Пятроўны ў статус сацыяльнага і засяліць сюды людзей, якія маюць на яго права, а ёй выдзеліць больш зручнае — таксама сацыяльнае.

Вельмі слушныя прапановы ўнесла былы работнік адукацыі Людміла Косціна: больш увагі звяртаць на стварэнне ў горадзе безбар'ернага асяроддзя для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У Клецку такіх няшмат, але яны ёсць. Барыс Батура даручыў яшчэ раз абследаваць грамадскія месцы, якімі найбольш карыстаюцца інваліды — а гэта аб'екты гандлю, бальніца, кінатэатр, пошта — і па магчымасці вырашыць пытанне.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

САЦЫЯЛЬНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ: каму, як і ў якіх выпадках?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пасля збору ўсіх неабходных дакументаў (і пры наяўнасці паказанняў для абслугоўвання і адсутнасці супрацьпаказанняў) з чалавекам заключаецца дагавор на сацыяльнае абслугоўванне дома. Устанаўліваецца дата, з якой пачынаецца абслугоўванне, перыядычнасць яго наведвання сацыяльным работнікам і кошт абслугоўвання. Выдаецца загад аб залічэнні на абслугоўванне і замацоўваецца канкрэтны сацыяльны работнік.

2) *Якімі відамі сацыяльных паслуг можа скарыстацца інвалід, які пражывае ў сельскай мясцовасці?*

— Сацыяльнае абслугоўванне інвалідаў і пажылых грамадзян, у тым ліку тых, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, ажыццяўляюць тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

Такія цэнтры аказваюць грамадзянам, што знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, разнастайныя сацыяльныя паслугі з улікам іх патрэбнасці (а таксама ў адпаведнасці з паказаннямі і супрацьпаказаннямі да абслугоўвання, якія вызначаюцца ўстановамі аховы здароўя).

Так, грамадзянам, якія часткова або цалкам страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння і не маюць супрацьпаказанняў да абслугоўвання, сацыяльныя работнікі аказваюць сацыяльна-бытавую дапамогу дома (дастаўка прадуктаў харчавання, медыкаментаў, тавараў першай неабходнасці, садзейнічанне ва ўборцы кватэры, аплата жылля і камунальных паслуг, дастаўка вады, паліва і бульбы са сховішча і інш.), арганізуюць сацыяльна-бытавое абслугоўванне прадпрыемствамі гандлю і некаторыя іншыя паслугі.

У аддзяленнях тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання цэнтраў могуць прадастаўляцца разавыя сацыяльна-бытавыя паслугі на даму (дапамога ў распілоўцы і складзіраванні дроў, рамонце надворных пабудоў, апрацоўцы прысядзібных участкаў і да т.п.). Таксама для тых, хто цалкам страціў здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння (ляжачых), могуць прадастаўляцца паслугі пагадзіннага дзённага догляду.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Можна скарыстацца і паслугамі псіхолага.

У сельскай мясцовасці для адзінокіх і адзінока пражываючых грамадзян, якія па якіх-небудзь прычынах не могуць пражываць самастойна, у цэнтрах функцыянуюць аддзяленні кругласутачнага знаходжання. Тут грамадзянам часова (на тэрмін ад аднаго да шасці месяцаў) прапануюць жыллё і рацыянальнае харчаванне, праводзяць рэабілітацыйныя і санітарна-гігіенічныя мерапрыемствы, лячэнне, арганізуюць догляд, культурныя мерапрыемствы.

Для маладых інвалідаў (у тым ліку выпускнікоў цэнтраў карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі) у цэнтрах функцыянуюць аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў, якія забяспечваюць магчымасць развіцця працоўных навыкаў, заняткі па інтарэсах і г.д.

Па больш падрабязную інфармацыю неабходна звяртацца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы жыхарства.

3) *Сацыяльныя работнікі прадастаўляюць паслугі ў адпаведнасці з нормамі. Якія гэта нормы і кім яны ўстаноўлены?*

— Сапраўды, сацыяльныя паслугі, якія ўваходзяць у Пералік бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг, прадастаўляюцца ў межах нормаў і нарматываў забяспечанасці грамадзян такімі паслугамі, якія ўстаноўлены пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4 красавіка 2003 г. № 456.

Напрыклад: норма паслугі па дастаўцы прадуктаў харчавання, прамысловых тавараў першай неабходнасці складае 1 заказ вагой да 7 кг у дні візітаў сацыяльнага работніка;

норма паслугі па мыцці аконных шыб і аконных вокладак — 2 заказы ў год.

Калі чалавек жадае атрымаць такія паслугі ў большым аб'ёме, ён можа заказаць іх за дадатковую плату.

Святлана БУСЬКО.

■ Тры пытанні з нагоды

ЛЕПШ РАЗ УБАЧЫЦЬ...

Нагода для размовы са старшынёй Лунінецкага райвыканкама Васілём АГІЕВІЧАМ — новыя формы інфармавання насельніцтва

ПАДЧАС літаратурнага фестывалю «Лунінская восень» госці мелі магчымасць наведаць шэраг аб'ектаў, якія нядаўна былі здадзены ў райцэнтры. Уразілі спартыўны комплекс з басейнам, дзе займаюцца юныя спартсмены розных узроставых катэгорый, і лядовая арэна, дзе паспелі набраць каманду дзяўчынак для заняткаў хакеем. Вечарам тут адпачываюць і папраўляюць здароўе гараджане. Яшчэ нядаўна жыхары палескага гарадка аб такіх дасягненнях цывілізацыі і не марылі. Літаратары адзначылі, што горад развіваецца, і пацікавіліся: што ж новага ў вёсках? У адказ пачулі пра рэканструкцыю і ўзвядзенне новых аб'ектаў жывёлагадоўлі і аб знаёмстве з гэтым працэсам гарадской грамадскасці.

— Васіль Міхайлавіч, як узнікла ідэя арганізаваць такі тур па сельгаспрадпрыемствах і аграгарадках?

— Мы палічылі, што традыцыйныя дні інфармавання са звыклымі ўжо выступленнямі службовых асоб у працоўных калектывах не заўсёды даюць чаканы эфект. Адна справа — пераконваць, нехай сабе і з лічбамі, фактамі, наглядным матэрыялам, але ўсё ж на словах; і зусім іншая — паказаць у рэальнасці, каб людзі ўбачылі самі, змаглі паглядзець, пагаварыць з працаўнікамі, задаць пытанні. Таму былі сабраны дзве групы гараджан з ліку работнікаў культуры, адукацыі, медыцыны, а таксама рабочых прамысловых прадпрыемстваў, прадстаўнікоў творчых прафесій і служачых устаноў. У такім складзе мы наведалі шэраг сельгаспрадпрыемстваў.

— Што канкрэтна вы ім паказвалі ў вёсцы?

— Былі распрацаваны два маршруты. Адзін аўтобус накіраваўся ў сельскагаспадарча-вытворчы комплекс «Хваецкае», «Лунінскае», філіял «Любчанскае» Лунінецкага малочнага завода. Другая група наведала «Вулькаўскі свінтанак» і ўнітарнае прадпрыемства «Міжлескае». У «Хваецкім» мы паглядзелі рэканструяваную ферму з сучаснай даільнай залай, убачылі, як вядзецца рэканструкцыя другой фермы ў гаспадарцы. Тут жа мы зазірнулі ў рамонтную майстэрню, дзе для працаўнікоў створаны належныя бытавыя ўмовы. Ёсць пакой для прыёму ежы, раздзявальні, лазня — усё для таго, каб пасля рамонтных работ альбо змены ў полі працаўнік мог прывесці сябе ў парадак, а ў абедзенны перапынак меў магчымасць прыстойна адпачыць.

У «Лунінскім» гасцей уразіла новая малочнатаварная ферма на 720 галоў з суперсучаснай даільнай залай. Там увесь вытворчы працэс камп'ютарызаваны. Апаратура кантралюе захаванне тэхналогіі. «Вулькаўскі свінтанак» прадэманстраваў не толькі новую ферму, якая была ўзведзена адной з першых у раёне, але і сучаснае бульбасховішча. У «Міжлескім» мы паказалі гасцям увесь цыкл утрымання жывёлы ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі на прыкладзе малочнатаварнай фермы на 800 галоў буйной рагатай жывёлы. Па суседстве з гэтай фермай, дарэчы, распачата будаўніцтва комплексу на 1000 галоў.

Відавочна, што пасля такой экскурсіі зусім па-іншаму ўспрымаецца інфармацыя аб тым, што жывёлагадоўчы цэх раёна перажывае абнаўленне, што здадзена сем новых фермаў, на падыходзе — пяць, што ўведзены ў строй два новыя бульбасховішчы.

— Якая была рэакцыя? Якія водгукі давялося пачуць?

— Водгукі пераўзышлі нашы чаканні. Для таго, хто бывае на падобных аб'ектах часта, усё падаецца звычайным. Зусім інакш з гараджанамі. Аказалася, многія людзі, якія пастаянна жывуць у горадзе, думалі, што дагэтуль кароў дояць рукамі альбо элементарнымі апаратамі савецкай эпохі, а малако носяць вёдрамі. А ўжо бульбасховішчы здзівілі некаторых наведвальнікаў, — быццам гэта абаронныя ангары. Адна чыгуначніца прызналася: раней яна думала, што па тэлевізары паказваюць толькі ўзорна-паказальныя фермы і комплексы, якіх у палескай глыбінцы ў вочы не бачылі. Юрыст буйнога прамысловага прадпрыемства адзначыў захаванне санітарных нормаў пры вытворчасці малака. Раней ён уяўляў сабе гэты працэс па-іншаму.

Наведвальнікі задавалі шмат пытанняў як кіраўнікам сельгаспрадпрыемстваў, так і яго працаўнікам; цікавіліся зарплатай, сацыяльнымі аспектамі жыцця вёскі. На адным з аб'ектаў нават прагучала пытанне аб тым, ці патрэбныя ім кадры. І тады я канчаткова зразумеў, што мерапрыемства працуе не дарэмна.

Святлана ЯСКЕВІЧ ■

■ Дабрачыннасць

НАШЫ СЭРЦЫ — НАШЫМ ДЗЕЦЯМ

10 снежня ў Беларусі стартавала навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці».

На працягу цэлага месяца кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых органаў улады будуць наведваць дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, апякунскія, прыёмныя сем'і, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, дзіцячыя бальніцы, каб павіншаваць дзяцей і ўручыць ім навагоднія падарункі.

Па традыцыі ў дабрачыннай акцыі асабіста ўдзельнічаюць кіраўнік дзяржавы, члены ўрада, прадстаўнікі дэпутацкага корпуса, Адміністрацыі Прэзідэнта, Канстытуцыйнага Суда, Нацыянальнага банка, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі.

Цэнтральнай падзеяй акцыі стане навагоднае свята ў Палацы Рэспублікі з удзелам Прэзідэнта. Мерапрыемства запланавана на 27 снежня. Яго ўдзельнікамі стануць больш як 2 тысячы дзяцей з усіх рэгіёнаў краіны: пераможцы алімпіяд, творчых конкурсаў і спартыўных спаборніцтваў, лідары дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый, дзеці-сіроты і дзеці, што засталіся без бацькоўскай апекі, дзеці-інваліды, дзеці са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў.

Між іншым, акцыя пройдзе ў Беларусі ўжо ў 16 раз. Падчас апошняй акцыі кіраўнікі розных дзяржаўных органаў і арганізацый наведалі больш як 170 школ-інтэрнатаў, дзіцячых дамоў, дамоў дзіцяці і шматдзетных сем'яў і г.д. Акрамя традыцыйных салодкіх падарункаў падчас дабрачыннай акцыі былі перададзены таксама рамонтна-будаўнічыя матэрыялы, камп'ютарная тэхніка і цацкі, адзенне і абутак, мэбля і спартыўны рыштунак.

Надзея НІКАЛАЕВА ■

■ 100 славутых прозвішчаў Беларусі

БАГУШЭВІЧЫ

Францішак Багушэвіч — пачынальнік беларускай літаратуры і абуджальнік нацыянальнай свядомасці беларускага народа

Францішак Багушэвіч з'яўляецца самай яркай фігурай у беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Паэт, празаік, публіцыст, перакладчык. Ён па праве лічыцца адным з пачынальнікаў беларускай літаратуры, заснавальнікам грамадзянскай паэзіі на Беларусі. Яго ідэйная спадчына з'явілася фундаментам ідэалогіі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пачатку XX стагоддзя. Дзякуючы Францішку Багушэвічу ўпершыню ў гісторыі нашай краіны грамадскія і палітычныя ідэалы былі скіраваны на адраджэнне Беларусі, а не на адраджэнне Вялікага Княства Літоўскага або Рэчы Паспалітай, як гэта было ў дабагушэвічаўскі перыяд.

НЯПРОСТЫ ШЛЯХ ДА НАРОДА

Паэтычны дар, які пакінуў пясняр народных дум і спадзяванняў Францішак Багушэвіч, несумненна, з'яўляецца найкаштоўнейшым здабыткам айчыннай літаратуры. Але шлях твораў паэта да народа быў няпросты. Яго спадчына не дайшла да нас у поўным выглядзе. Пры жыцці паэта яго творы ў царскай Расіі былі забаронены. Асобнымі кнігамі выйшлі толькі ў час рэвалюцыі 1905—1907 гадоў, але неўзабаве былі арыштаваны. У Савецкай Беларусі ў 20-я гады зборнікі паэта былі выдадзены. Але ўжо праз некалькі гадоў уся творчасць паэта была абвешчана буржуазна-кулацкай і нацыяналістычнай і забаронена. Па сведчанні даследчыкаў творчасці паэта, 3 чэрвеня 1937 года Галоўліт БССР выдаў загад № 33, згодна з якім віленскія, ковенскія і нават перыяду БССР выданні твораў Францішка Багушэвіча павінны былі спальвацца. Вядомы цікавы факт, які сведчыць аб тым, што будучы кіраўнік Польшчы Юзэф Пілсудскі ў маладосці асабіста кіраваў кантрабандай «Дудкі беларускай» Багушэвіча з Кракава ў Беларусь. І толькі пасля 40-х гадоў аднавілася выданне твораў пісьменніка. Больш за тое, асобныя творы паэта былі ўключаны ў школьную праграму па беларускай літаратуры, што дало магчымасць дзецям пазнаёміцца са спадчынай слыннага класіка зямлі беларускай.

Будучы кіраўнік Польшчы Юзэф Пілсудскі ў маладосці асабіста кіраваў кантрабандай «Дудкі беларускай» Багушэвіча з Кракава ў Беларусь.

Захаваўся сямейны альбом Францішка Багушэвіча, а таксама яго эпісталярная спадчына. Цікавыя дакументальныя сведчанні абставін жыцця паэта, гісторыі напісання яго твораў захоўваюцца ў архівах Беларусі, Польшчы, Украіны і Літвы. Удзячныя нашчадкі ўшанавалі памяць паэта: у бары каля Кушлянаў устаноўлены камень-помнік Багушэвічу, камень Багушэвіча ёсць і ва ўрочышчы Лысая Гара недалёка ад Кушлян на тэрыторыі Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці, на могілках каля вёскі Жупраны ўстаноўлены помнік паэту, у інтэр'еры Жупранскага касцёла ёсць мармуровая пліта з надпісам «Францішку Багушэвічу. 1840—1900. Сябры». У Жупранах устаноўлены бюст Багушэвіча і адкрыты музей Францішка Багушэвіча, у Кушлянах захавалася сядзіба, якая належала паэту (зараз там працуе Дом-музей Багушэвіча). У райцэнтры Гродзенскай вобласці — горадзе Смаргонь — усталяваны бронзавы помнік Францішку Багушэвічу. Ушаноўваецца памяць пра нашага слаўнага земляка і за межамі Беларусі: ва Украіне ў горадзе Нежыне на будынку, дзе вучыўся беларускі паэт, установлена мемарыяльная дошка, яго імем названа вуліца ў горадзе Канатопе, памятная шыльда ўстаноўлена і ў вёсцы, дзе нарадзіўся паэт — у Свіранах (Літва). Адна з бібліятэк Літвы носіць імя паэта, вуліца Багушэвіча ёсць у літоўскім мястэчку Рукойні. У Вільні на месцы дома, у якім з 1884 па 1898 год жыў Багушэвіч, усталявана мемарыяльная шыльда.

СВЯТЫЯ СЛОВЫ ПАЭТА

Францішак Багушэвіч выдатна разумеў, што нацыянальная мова — найважнейшая форма выяўлення духоўнасці народа. Словы, пачэрпнутыя з народных моўных глыбінь і па-майстэрску апрацаваныя пісьменнікам, трывала ўвайшлі ў лексічны склад сучаснай беларускай мовы. Акрамя стварэння літаратурных твораў, паэт займаўся лексікаграфічнай працай: збіраў слоўнік беларускіх слоў. Уся творчасць паэта садзейнічала выпрацоўцы моўных нормаў і развіццю сучаснай беларускай мовы. А словы аб значнасці для народа нацыянальнай мовы, сказаныя Францішкам Багушэвічам у прадмове да зборніка «Дудка беларуская» ў 1891 годзе, застаюцца актуальнымі і сёння, хаця мінула больш за сто гадоў. Яны гучаць як своеасаблівы заклік шанаваць і развіваць беларускую нацыянальную культуру і яе першаэлемент — нацыянальную мову:

«Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маёй! Вам ахвяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі ды і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя «мужыцкай» завуць, а завецца яна «беларускай». Я сам калісь думаў, што мова наша — «мужыцкая» мова і толькі таго. Але, паздароў Божа добрых людцоў, як навучылі мяне чытаць, пісаць, з той пары я шмат гдзе быў, шмат чаго відзеў і чытаў: і праканаўся, што мова наша ёсць такая людская і панская, як і французская альбо нямецкая, альбо іншая якая. Чытаў я ці мала старых папераў па дзвесце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі і пісаных вялікімі панамі, а нашай мовай чысцюсенькай, як бы вот цяпер пісалася. Увідзеўшы гэта, я часта думаў: Божа ж мой Божа! Што ж мы за такія бяздольныя?! Якаясь маленькая Булгарыя — са жменя таго народу — які-ясьці харваты, чэхі, маларосы і другія пабратымцы нашыя... маюць па-свойму пісаныя і друкаваныя ксёнжачкі і газеты, і набожныя, і смешныя, і слёзныя, і гісторыйкі, і баечкі; і дзеткі іх чытаюць так, як гавораць, а ў нас як бы захацеў цыдулку ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык можа б і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што «піша па-мужыцку» і як дурня абсмяялі б! Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, каторам мову займе, а потым і зусім замёрлі... Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы... Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільні да Мазыра, ад Віцебска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Мінск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак...». Радкі з гэтай прадмовы паэта ў наш час увекавечаны на будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

РАДАСЛОЎНАЯ ФРАНЦІШКА БАГУШЭВІЧА І ПАХОДЖАННЕ ЯГО ПРОЗВІШЧА

Гісторыкі сведчаць, што па мацярынскай лініі Францішак Багушвіч паходзіць са шляхецкага роду, дзявочае прозвішча маці — Галаўня. Захаваліся актавыя кнігі, у якіх ёсць запіс, паводле якога значыцца, што продак паэта Антон Багушэвіч за 450 польскіх злотых набыў маёнтак Кушляны, або Мігуцяны, з сялянамі. А да гэтага род Багушэвічаў у пачатку XVIII стагоддзя жыў у Полацкім ваяводстве. У архіўных матэрыялах захаваўся запіс, згодна з якім «7 чэрвеня 1729 года Міхаіл Савіцкі падпісаў дароўную, згодна з якой маёнтак Шкірлава, або Бароўшчына, з вёскай Хвашчаны і Мышкавічы (разам з сялянамі) у Полацкім ваяводстве падараваў швагру свайму Юрыю Аўгусцінаву Багушэвічу і яго сыну Казіміру, а іншых яго сыноў Антона і Франца Багушэвіча грашыма адарыў». Сваякі паэта ў канцы XVIII стагоддзя былі запісаны шляхтай Віленскай губерні, а ў 1830 і 1845 гадах іх шляхецкія прывілеі пацвердзіў сенат геральдыі.

На вялікі жаль, прамыя нашчадкі паэта не прадоўжылі справу бацькі на ніве адраджэння беларушчыны.

Францішак Багушэвіч, як правіла, падпісваўся псеўданімамі: *Demos, Huszicz, Ten, Tamten Мацей Бурачок, Рэўка з-пад Барысава*. Прозвішча *Багушэвіч* утворана на аснове асабовага мужчынскага імя *Богуш*, якое, у сваю чаргу, з'яўляецца скарочаным народным варыянтам старажытных поўных славянскіх імёнаў *Багуслаў, Багумір*. У старажытнасці такія імёны звычайна замацоўваліся за прадстаўнікамі вышэйшых саслоўяў.

СУЧАСНЫЯ БАГУШЭВІЧЫ

Прозвішча *Багушэвіч* даволі часта сустракаецца ва ўсіх абласцях нашай краіны, але найбольш частае яно на Міншчыне і Гродзеншчыне: Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці; Верхнядзвінскі, Пастаўскі, Полацкі раёны Віцебскай вобласці; Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці; Ашмянскі, Воранаўскі, Гродзенскі, Іўеўскі, Карэліцкі, Навагрудскі, Слонімскі, Шчучынскі раёны Гродзенскай вобласці; Барысаўскі, Клецкі, Мінскі, Пухавіцкі, Салігорскі, Слуцкі, Уздзенскі раёны Мінскай вобласці. Вядомае гэта прозвішча і на землях суседніх дзяржаў: Польшчы, Украіны, Расіі і Літвы.

Нярэдка адзначаецца імя *Богуш* і вытворнае ад яго прозвішча ў асновах назваў населеных пунктаў: вёска *Багушы* ў Брагінскім раёне Гомельскай вобласці, Баранавіцкім раёне Брэсцкай вобласці, Смаргонскім, Шчучынскім раёнах Гродзенскай вобласці, вёска *Багушоўка* ў Бабруйскім і Шклоўскім раёнах Магілёўскай вобласці, вёска *Багушова* ў Полацкім раёне Віцебскай вобласці, вёска *Багушэвічы* ў Глыбоцкім раёне Віцебскай вобласці, гарадскі пасёлак *Багушэўск* у Сенненскім раёне Віцебскай вобласці, хутар *Багушкі* ў Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці, вёска *Багушоўка* ў Гродзенскім раёне Гродзенскай вобласці.

Ігар КАПЫЛОЎ

■ Правер сябе

ПЫТАННІ ДЛЯ ЦІКАЎНЫХ

Сёння мы падводзім вынікі гістарычнай віктарыны, якая ладзілася ў «Ігуменскім тракце». Дзякуй усім, што былі з намі ды бралі ўдзел! Разам мы вандравалі па далёкіх і зманлівых старонках мінуўшчыны. Ваша цікавасць і вашы адказы — галоўная прыкмета таго, што наша гісторыя жывая і не забытая. Адметна і тое, што былі людзі, якія амаль заўсёды давалі правільныя адказы (сапраўдныя знаўцы!). Яны ж перамаглі і ў мінулым туры, правільна даслаўшы ўсе адказы:

1. Скроневыя кольцы; 2. Грыўня; 3. Пацір; 4. Абклад; 5. Нумізматыка; 6. Кляймо; 7. 4 ступені; 8. Зярненне.

Такім чынам, у гістарычнай віктарыне перамаглі Уладзімір ДРАБЫШЭЎСКІ з Полацка, а таксама Аляксандр ГАНЧАРОЎ з аграгарадка Нісімкавічы Чачэрскага раёна. Нашы віншаванні і ўдзячнасць! Мы звяжамся з вамі, каб перадаць падарункі ад газеты «Звязда» і Нацыянальнага гістарычнага музея. А заахвочвальны прыз атрымае Ірына Гладкая з аграгарадка Чачкава Мінскага раёна.

Спадзяёмся, нашы ідэі і ваша цікавасць і надалей не будуць разыходзіцца

■ Меркаванне

КРЫЛЫ ЛЬНЯНЫЯ

ЯКОЕ месца ручнікі займаюць у жыцці сучаснага чалавека? Чым могуць яны прывабіць сёння? І ці адлюстроўвае наша стаўленне да ручнікоў узровень нацыянальнай самасвядомасці беларусаў? Адказ на гэтыя пытанні спрабуюць даць супрацоўнікі гісторыка-краязнаўчага музея Сялецкаўскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы садок — сярэдняя школа Касцюковіцкага раёна, які ўзначальвае Раіса Азаранка.

На пачатку сваёй гісторыі музей уяўляў сабой невялічкі пакой. Пасля рэканструкцыі школы ён быў перанесены ў большае па памерах памяшканне, і зараз складаецца з дзвюх залаў: этнаграфічнай і гістарычнай. У этнаграфічнай зале сабраны матэрыялы, якія адлюстроўваюць ранейшы побыт беларусаў: ручнікі, адзенне, прылады працы, вырабы рамеснікаў. У гістарычнай зале адлюстравана жыццё вёскі ад моманту заснавання і да нашых дзён. Таксама тут можна даведацца аб гісторыі партызанскага руху ў Касцюковіцкім раёне (у прыватнасці, партызанскага атрада «За Советскую Белоруссию»), жыцці вядомых людзей вёскі і раёна і многім іншым.

Музейную справу Раіса Яфрэмаўна пачынала яшчэ ў 1984-м — у той час, калі займала пасаду дырэктара школы. Пасля выхаду на заслужаны адпачынак яна пачала весці ў школе гурток па краязнаўстве. Заняткі стараецца пабудаваць на мясцовым матэрыяле. Тут вучні знаёмяцца з рамёствамі, якія былі распаўсюджаны ў вёсцы, іх вырабамі...

Адно са святаў, падрыхтаваных Раісай Яфрэмаўнай, называлася «Крылы льняныя — матчын ручнік». Як відаць з назвы, прысвечана яно было аднаму з прадметаў народнага мастацтва, які належыць і мінуламу, і сучаснасці, — ручніку. Адной з мэт было знаёмства з беларускім ручніком як прыкладам высокамастацкай тканіны, з тэхналогіяй вырабу, прызначэннем ручніка. Галоўнай жа мэтай правядзення было выхаванне цікавасці і павагі да культурных здабыткаў свайго народа.

Зала, у якой праводзілася мерапрыемства, была ўпрыгожана ручнікамі з рознымі відамі вышыўкі (крыжыкам, гладдзю), зробленымі рукамі мясцовых майстрых у ранейшыя і цяперашнія часы. Раіса Яфрэмаўна расказала прысутным аб працэсе стварэння ручніка, відах ткацтва, растлумачыла значэнне колераў, якія прысутнічалі на ручніках у мінулым: чорны сімвалізаваў сабой зямлю, без якой немагчыма жыццё, чырвоны — радасць, белы — жыццёвы шлях чалавека.

Сцежкамі ў полі
ўздоўж дарожных даляў
Вышытыя роўна
ручнікі ляжалі —
Белыя, даўгія...
... У покуці павесіць,
на абраз у хату
Альбо перакінуць
цераз плечы свату...

Гэтыя радкі з верша Л. Геніюш гаворыць нам аб прызначэнні ручнікоў.

Сёння здараецца, што чалавек прапануе ручніку ў сваім жыцці і лёсе незайздросную долю: стаць музейным экспанатам і размаўляць з намі на мове мінулых пакаленняў, якую, на жаль, многія з нас ужо не разумеюць, ці, яшчэ горш, стаць проста прамысловым таварам (праўда, значнага кошту), заняць адпаведнае месца на магазінных паліцах і чакаць, пакуль хтосьці заўважыць яго сярод сучасных прыгожых, але часта бездухоўных вырабаў. Радуе тое, што, па-першае, ручнікі «жывуць» у многіх гарадскіх сем'ях, прычым не толькі ў якасці радавой рэліквіі, але і прадмета хатняга ўжытку; па-другое, ручнікі займаюць даволі бачнае і пачэснае месца ў многіх музеях краіны; па-трэцяе, ручнікам даюць новае жыццё сталічныя тэатры.

Праходзяць гады, мяняюцца густы, на змену рукам чалавечым прыходзяць машыны, створаныя тымі ж рукамі. Але пакуль побач з чалавекам будзе жыць пачуццё прыгожага, імкненне да натуральнага, сапраўднага, будзе жыць ручнік, бо спрадвечнае застаецца вечным.

Алена ЛЕБЕДЗЕВА,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры
Сялецкаўскага ВПК
Касцюковіцкага раёна
Магілёўскай вобласці

Кулінарная Энцыклапедыя
Мікалая Нікіфароўскага

ЛАХМАН НЕ АДЗЕЖА, ЗАЦІРКА НЕ ЕЖА

НА гэты раз сваімі смачнымі рэцэптамі з намі вырашылі падзяліцца паварыхі, што працуюць у гандлёвым комплексе БДПУ імя Максіма Танка. Яны распавялі, што ў іх вельмі дружны калектыў, таму і рэцэпты ў «Звязду» яны вырашылі даслаць сумесна. Кожная іх раніца пачынаецца з таго, што яны ўсе разам садзяцца і абмяркоўваюць меню на наступны дзень. А сам працэс прыгатавання страў ідзе зладжана і весела. Пэўна, і за кошт добрага настрою іх прысмакі для студэнтаў і іншых наведнікаў сталовай атрымліваюцца яшчэ крышачку смачнейшымі. Такім чынам, нам напісалі Ірына Шаг, Людміла Свірчэўская, Ніна Захарэнка, Вікторыя Рашэтнікава і Галіна Козіч.

Каб зварыць зацірку па-сялянску, надзёртую бульбу праціраюць з мукой і засыпаюць у сумесь малака і вады, якая кіпіць, перыядычна памешваючы, вараць да гатоўнасці, дабаўляюць соль, цукар. Напрыканцы зацірку запраўляюць маслам.

Таксама жанчыны прапанавалі прыгатаваць поліўку беларускую. Для гэтага жытні хлеб наразаюць лустамі, падсушваюць, здрабняюць і заліваюць невялікай колькасцю гарачага булёна, настойваюць і праціраюць. Затым дадаюць булён, што застаўся, грыбны адвар і даводзяць да кіпення. У булён, які кіпіць, кладуць падсмажаную цыбулю, моркву, таматнае пюрэ, звараныя нашаткаваныя грыбы і вараць 5-10 хвілін. Падаюць поліўку са смятанай, асобна ставяць смажаную бульбу.

Раскажыце і вы нам пра свае беларускія кулінарныя шэдэўры!

Працягнем знаёмства з вадкімі стравамі сялян Віцебшчыны. Нікіфароўскі сцвярджае, што вадкі аўсяны кісель, які займае сярэдзіну паміж поліўкай і сапраўдным кісялём, пра які мы ўзгадвалі ў адным з папярэдніх артыкулаў, называецца «жу́рам, журыхай». І гэта вельмі важнае сцвярджэнне, бо доўгія гады сярод даследчыкаў і кулінараў вядуцца спрэчкі аб тым, які жур можна лічыць беларускім: аўсяны, жытні, пшанічны ці грэцкі. Дык вось, наш слынны этнограф піша, што для паўночнага рэгіёна Беларусі быў характэрны жур з аўсянай цэжы. Гатавалі яго на адзін-два разы і ўжывалі цёплым, бо ў халодным выглядзе ён быў годны хіба на тое, каб выліць яго ў сабачае або свіное карыта. Дарэчы, назва стравы, як і назва журавін, паходзіць ад старагерманскага кораня sauer (кіслы, кіснуць). Гэты суп і зараз вельмі папулярны ў палякаў, дзе ён завецца «журэк», а харчовая прамысловасць выпускае ў бутэльках мучную закваску — «жур». Таму для прыгатавання гэтай старыжытнай стравы большасць польскіх гаспадынь набывае паўфабрыкат. Зручна і хутка. А што ў нас? Нашы рэстаратары робяць спробы адрадзіць цікавую і смачную страву. Ці дойдзе яна да шырокага спажыўца? Час пакажа.

«Зацірку» гатавалі з пшанічнага, грэцкага ці ячменнага прэснага цеста, якое праціралі праз рэшата або між рук. Атрыманыя крупінкі падвяльвалі на палатне, а потым гатавалі, як суп. Калі ж прэснае цеста секлі нажом або секачом, то атрыманая з яго страва называлася «сяка́нкай». Абедзьве гэтыя нарыхтоўкі рабілі загадзя і захоўвалі ў падвешаных каля печы палатняных мяшэчках, каб зберагчы ад вільгаці і мышэй. «Зацірка» і «сяканка» гатаваліся хутка: дастаткова было ў кіпень на некалькі хвілін насыпаць самаробных нарыхтовак з цеста, дадаць масла або малака — і страва была гатова. Іншая справа, калі яна гатаваліся з мясам, тады, вядома, яго трэба было варыць амаль да гатоўнасці, а ўжо потым дадаваць нарыхтоўкі з цеста. Але класічнай лічылася малочная «зацірка» («Зварыла зацірку, што аж гоніць слінку, //Бела забяліла, як тую сняжынку»). Страва была не вельмі спажыўнай, што спарадзіла наступную прымаўку: «Лахман не адзежа, зацірка не ежа».

Як гэта не дзіўна, шаноўныя чытачы, але ужо ў XIX стагоддзі ў лексіконе сялян Віцебшчыны было італьянскае слова «макарона», якое яны на мясцовы лад перайначалі ў «мыкаро́ну». Думаецца, што трапіла яно да нас ад палонных салдат напалеонаўскай арміі, многія з якіх знайшлі на нашых землях сваю другую радзіму. Вось толькі ў італьянцаў гэтым словам называецца харчовы прадукт з прэснага цеста ў выглядзе тонкіх трубачак, а мясцовая «мыкаро́на», сцвярджае Нікіфароўскі, — гэта даволі грубая, часта нясмачная локшына з хатняй пшанічнай мукі. У хатах заможных гаспадароў па святах гатавалася забеленая «мыкарона» з фабрычнай мукі, якая лічылася ласункам.

«Гу́шчай» называўся суп з ячных круп, якія былі больш вядомыя пад назвай «абтоўканага ячменю», для прыгатавання якога, вядома, нельга было абысціся без ступы і таўкача. Ужо адна назва гэтай стравы гаворыць пра тое, што яна адносілася да густых супоў. «Гушча» мела трэцюю частку юшкі, гатавалася без мяса і ўжывалася як цёплай, так і халоднай, часцей забеленай. Іншы раз падчас посту ў яе дадаваўся гарох або боб.

«Баўту́ха» таксама адносілася да густых супоў і бывала пшанічнай, ячнай, грэцкай, аўсянай і жытняй. Гатаваць яе вельмі проста: мука разводзіцца халоднай вадой, прысольваецца і перамешваецца (разбоўтваецца), што паўтараецца і пры варцы. Калі ж мука засыпалася ў кіпень, то страва называлася «калату́хай». Смак гэтых страў цалкам залежаў ад «дабаў» у выглядзе сала, масла або малака. Падчас посту «баўтуха» гатавалася з гарохавай ці бабовай мукі і ўжывалася выключна цёплай. Якасць гэтых страў залежыла ад умення кухаркі, якой трэба было не дапусціць іх ператварэння ў клейстар, утварэння камякоў і прыгарання. Пры падобных недаглядах шчасціла свінням і сабакам, у чые карыты трапляла ежа.

Гэтыя дзьве стравы можна было б назваць «куляшом». Можна было, калі б не адна акалічнасць: пад назвай «куляша» на Віцебшчыне была вядома асобная страва з ячменнай, гарохавай і бабовай мукі, якая па гушчыні займала сярэдзіну паміж блінным цестам і густым аўсяным кісялём. «Кулеш» быў сціплай хатняй стравай, якую ўжывалі ў цёплым выглядзе.

З разваранага гароху і бобу, якія праціраліся праз сіта, каб пазбавіцца ад шалупіння, а потым ахалоджваліся ў нізкім посудзе, гатавалі кісель, які называўся «бруско́, або сту́льцы». Гэта была посная страва і ўжывалася выключна з алеем. Перад падачай на стол «брускі» разразалі на невялікія квадрацікі. І што цікава: гэта была, бадай, адзіная страва, якую елі не лыжкамі або рукамі, а спецыяльнымі спіцамі з двума ці трыма зубцамі.

Яшчэ адна вельмі папулярная ў тыя гады страва называлася «камы». Яе гатавалі з адваранага гароху, бобу ці бульбы, якія таўклі ў ступе да атрымання пэўнай клейкасці. Потым з атрыманага падсоленага цеста фармавалі камякі велічынёй з кулак, якія для атрымання апетытнай скарыначкі на патэльні ставіліся ў печ. Мая бабуля Марыля рабіла камы з бульбы, фармавала іх у выглядзе піражкоў і начыняла грыбамі, морквай, капустай і іншай гародніна́й. Нам, унукам, даводзілася дапамагаць таўчы ў ступе бульбу, але вынік быў варты затрачанай працы: пры адным успаміне пра бабуліны камы ў мяне да гэтага часу цякуць слінкі. «Камы» былі поснай стравай, выкарыстоўваліся на «заедкі ці перакускі» і браліся ў дарогу. А ці гатавалі падобныя стравы ў вашай мясцовасці, шаноўныя чытачы?

Ужо ў XIX стагоддзі ў лексіконе сялян Віцебшчыны было італьянскае слова «макарона», якое яны на мясцовы лад перайначалі ў «мыкаро́ну». Думаецца, што трапіла яно да нас ад палонных салдат напалеонаўскай арміі.

Як вы заўважылі, для прыгатавання большасці вышэйназваных страў выкарыстоўваўся боб. Гэтая амаль забытая зараз расліна некалі была шырока распаўсюджана. Мы ў дзяцінстве любілі ласавацца маладым бобам, а яшчэ памятаю, як старэйшыя казалі, што купацца можна толькі тады, калі зацвіце боб (прыкладна сярэдзіна чэрвеня). Цікава, што калі пасля летняга збору струкоў зрэзаць надземную частку расліны, то яна адрасце і ўвосень дасць другі ўраджай. Боб змяшчае ў сабе каля 25% раслінага бялку, вартасць якога ў шмат разоў вышэйшая, чым бялку збожжавых. Боб цэняць і за вялікую колькасць клятчаткі, вугляводаў, тлушчоў, вітамінаў і мінералаў, а яшчэ ён быў беларускім афрадызіякам.

Аляксандр ВАШЧАНКА.

А цяпер класічны рэцэпт заціркі. НАМ СПАТРЭБІЦЦА: *1,5 шклянкі мукі, 1-2 яйкі, 40 г сметанковага масла, 6-7 шклянак малака, соль.*

Прасеяную пшанічную муку падсмажыць на патэльні без масла да светла-карычневага колеру, дадаць трошкі вады, яйка, масла, соль, старанна перацерці. Атрыманыя камячкі цеста засыпаць у каструлю з кіпячым малаком. Варыць 5-7 хвілін на невялікім агні, памешваючы. Дадаць соль на смак.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ ЧУП «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза»

Организатор аукциона: Частное унитарное предприятие «Научно-производственный центр Белкоопсоюза» (далее по тексту — ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза»), г. Минск, пр-т Победителей, 17, 1001. Тел. (029) 318 37 22, (017) 226 99 92, 226 91 19, 226 99 22.

Аукцион проводится 11 января 2013 г. в 14 часов 00 минут по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17

в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества организаций потребительской кооперации, собственником которого является Белкоопсоюз.

ЛОТ № 1 (В КОМПЛЕКСЕ): *здание склада с административно-бытовым помещением* (площадью 6616,96 кв.м, инв. № 730/С-1937) (на часть складского помещения и офис заключен договор аренды на срок по 28.02.2013); *трансформаторная станция* (площадью 30,9 кв.м, инв. № 730/С-11915); *здание магазина* (площадью 111,95 кв.м, инв. № 730/С-1935) с системой пожарно-охранной сигнализации; *здание склада вспомогательных служб* (площадью 122,9 кв.м, инв. № 730/С-71).

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 724050100001000153, на праве постоянного пользования, площадью 3,7068 га, по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, Мстиславское шоссе, 3.

Начальная цена продажи — 3 644 800 000 (три миллиарда шестьсот сорок четыре миллиона восемьсот тысяч) рублей без учета НДС.

Сумма задатка — 36 448 000 (тридцать шесть миллионов четыреста сорок восемь тысяч) рублей.

Условия продажи — нет.

ЛОТ № 2 (В КОМПЛЕКСЕ): *административное здание* **(площадью 216,2 кв.м, инв. № 700/С-14448);** *здание столярного цеха* **(площадью 285 кв.м, инв. № 700/С-14416);** *здание пункта первичной обработки пушнины* **(площадью 200,6 кв.м, инв. № 700/С-14453);** *здание отдела вентилируемых бункеров* **(площадью 74,8 кв.м, инв. № 700/С-14409);** *здание холодильника на 600 тонн* **(площадью 2 881,9 кв.м, инв. № 700/С-14412);** *здание ветпункта* **(площадью 195,9 кв.м, инв. № 700/С-14414);** *здание котельной* **(площадью 116,8 кв.м, инв. № 700/С-14411);** *здание сарая для свиней* **(площадью 153,5 кв.м, инв. № 700/С-14455);** *здание трансформаторной подстанции* **(площадью 16,7 кв.м, инв. № 700/С-14451);** *здание бригадного дома № 2* **(площадью 32,0 кв.м, инв. № 700/С-14457);** *здание бригадного дома №1* **(площадью 17,3 кв.м, инв. № 700/С-14459);** *здание склада №24* **(площадью 69 кв.м, инв. № 700/С-14449);** *здание склада ядохимикатов* **(площадью 30,3 кв.м, инв. № 700/С-14417);** *здание бытового помещения столярного цеха* **(площадью 65 кв.м, инв. № 700/С-14454);** *здание столярной мастерской* **(площадью 252,9 кв.м, инв. № 700/С-14445);** *здание склада-ангара* **(площадью 892 кв.м, инв. № 700/С-14415);** *здание швейного цеха* **(площадью 32,7 кв.м, инв. № 700/С-14452);** *здание пристройки к насосной станции* **(площадью 61,6 кв.м, инв. № 700/С-14446);** *здание проходной* **(площадью 39 кв.м, инв. № 700/С-14456);** *здание трансформаторной подстанции* **(площадью 22,9 кв.м, инв. № 700/С-14447);** *здание бригадного дома №3, 7* **(площадью 82,8 кв.м, инв. № 700/С-14458);** *здание бригадного дома №4, 5, 6* **(площадью 97 кв.м, инв. № 700/С-14460);** *здание гаражей* **(площадью 602,7 кв.м, инв. № 700/С-14403);** *здание кормокухни* **(площадью 702,3 кв.м, инв. № 700/С-14407);** *здание столярного цеха-пилорамы* **(площадью 160 кв.м, инв. № 700/С-14404);** *здание холодильника на 500 тонн* **(площадью 577,1 кв.м, инв. № 700/С-14405);** *здание склада №29* **(площадью 396,0 кв.м, инв. № 700/С-14450).**

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 724480401601000095, на праве постоянного пользования, площадью 19,0922 га, по адресу: Могилевская обл., Могилевский р-н, Вейнянский с/с, 1, 1/5, 1/2, 1/3, 1/1, 1/4, 1/6, 1/11, 1/8, 1/21, 1/20, 1/26, 1/17, 1/9, 1/10, 1/18, 1/16, 1/19, 1/7, 1/12, 1/23, 1/22, 1/24, 1/13, 1/25, 1/15, 1/27 соответственно.

Начальная цена продажи — 5 640 175 440 (пять миллиардов шестьсот сорок миллионов сто семьдесят пять тысяч четыреста сорок) рублей без учета НДС.

Сумма задатка — 56 401 754 (пятьдесят шесть миллионов четыреста одна тысяча семьсот пятьдесят четыре) рубля.

Условия продажи — нет.

Задаток перечисляется ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза», р/с 3015201080017, УНН 100060419, ОКПО 14586268, ф-л МГД ОАО «Белагрепромбанк» г. Минска, код 963.

Сведения о продавце: Торговое частное унитарное предприятие «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза», 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 62, тел. (017) 291 05 44.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты, связанные с организацией и проведением аукциона. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных платежей продавец заключает с ним договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и условия оплаты за объекты: определяются по согласованию победителя торгов с собственником имущества при заключении договора купли-продажи (ориентировочно в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи).

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17, каб. 1004а, 1001 с 8.30 до 12.30 и с 13.30 до 17.30 в рабочие дни. Прием документов заканчивается в 12 часов 30 минут 10 января 2013 г.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в Извещении;
